ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЕУ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ

КОШТ НОМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 КАП.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, рэдактара 1-73, сэкрат. і к-ры . . . 72.

Подпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгаснікаў — р. 80 к. Для ўстаноў . . . 1 » — » З дадаткам «Чырвоная Беларусь»: Для рабочых, служачых і калгаснікаў 1 » — » Для ўстаноў . . . 1 » 20 »

Плата за абвесткі: За радок пэтыту . . . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . . . 40 » Пры шматразовым друкаваньні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ. № 63 || Субота, 21-га сакавіка 1931 г. || № 63

Трывожныя сыгналы з чыгункі гудуць аб прарывах

УСЕ ТЭРМІНЫ ПРАЙШЛІ, А АБЯЗЬЛІЧКА ЯШЧЭ ПОЎНАСЬЦЮ НЕ ЛІКВІДАВАНА

НЕАДКЛАДНА ПЕРАНЕСЬЦІ ЦЭНТР РАБОТЫ Ў ЦЭХ, БРЫГАДУ І ГРУПУ.—ДЭТАЛЁВА ВЫВУЧЫЦЬ ПРЫЧЫНЫ ПАЎТОРНАСЬЦІ РАМОНТУ, ДАБІЦЦА НАЙХУТЧЭЙШАГА ІХ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ

Нарадчыкі і выклікальшчыкі зрываюць спаранную

Праца нарадчыкаў пастаўлена ня так, як гэта патрабуецца. З-за няопытнасьці, а падчас і нядбайнасьці нарадчыкаў, некаторыя брыгады перасежваюць пакладзены для адпачынку час, другія выклікаюцца раней яго скарыстаньня. Нарадчыкі ня ведаюць, якія брыгады прымацаваны да паравозаў і бываюць выпадкі, што брыгады адрываюцца ад свайго паравозу і едуць на чыгунку. Нарадчыкі ня ведаюць, хто знаходзіцца ў адпачынку, хто хварэе і хто знаходзіцца ў дарозе.

Так, 19 сакавіка ТЭ Чабатар, ТЭП Клібанаў захварэлі, а нарадчыкі за імі паслалі рассыльную. 18-га сакавіка паслалі за Дубініным, у якога яшчэ ня скончыўся адпачынак. Раткевічу, Васіленка і Шаніну запісалі прагул, у той час, калі яны былі ў дарозе. Адміністрацыя дае галаваляпскія загады ў адносінах прымацаваньня брыгад да паравозаў і зьмяняе іх амаль па 10 азоў у дзень, з прычыны чаго цяжка ўлічыць, хто і да якога паравозу прымацаваны.

Загадчык брыгадамі Тузік працай зусім ня цікавіцца і ў нараднай амаль ня бывае. Няопытнасьць выклікальшчыкаў таксама дрэнна адбіваецца на працы. Быў выпадак, калі 18 га сакавіка выклікальшчык Ермалаеў, ня выклікаўшы брыгаду, заявіў, што брыгады няма дома, з прычыны таго, што ён не знайшоў Сквазнога завулку. 19 га сакавіка выклікальшчыца Сінай праходзіла па Пралетарскай ветцы каля самай дзяжурнай больш 4 гадзін і нікога ня выклікала, казаўшы, што згубіла адрасы.

За адну ноч аказаліся нявыкліканымі 4 чалавека, менавіта: Берзін, Лісіцын, Жаўняроўскі і Комало. З прычыны такіх адносін выклікальшчыкаў, затрымоўваюцца цягнікі і зрываецца спаранная язда.

Неабходна, у першую чаргу, наладзіць працу нарадчыкаў і падабраць добры штат выклікальшчыкаў. Адміністрацыя павінна не зьмяняць сваіх загадаў. Трэба завесьці агульную дошку ўсяго паравознага складу з паказальнікам нумару паравозу і якая брыгада да яго прымацавана, паказваючы пры дапамозе перамены жасьцянак, хто паехаў, а хто знаходзіцца дома. Гэта палегчыць працу саміх нарадчыкаў.

П. К.

Да ганебнага слупа разьгільдзяеў

Шмат машыністых Віцебскага раёну, якія атрымалі паравозы, ня сталі яшчэ дагэтуль сапраўднымі гаспадарамі іх. Машыніст Белы, пасьля прымацаваньня да паравоза, жадаючы крыху прагуляць у час гарачай прамыўкі, прапанаваў рамонтнікам зрабіць сярэдні рамонт, а гэта значыць, што паравоз і яго гаспадара трэба было б вывесьці са строю на некалькі дзён. Яшчэ горшымі гаспадарамі паказалі сябе машыністы Віндоўскі, Шыронаў і Рачынаў. Віндоўскі на паравозе Э—1468 прыбыў у дэпо з аслабшымі паршнёвымі кліньямі, а Шыронаў і Рачынаў—(паравоз Э—Ы) тры разы пісалі аб неабходнасьці агляду манжэт тормазнага цыліндру, у той час, калі быў няспраўны не манжэт, а штуцэр, які знаходзіўся ў машыніста пад рукою і які трэба было толькі павярнуць на палову абарота, каб спыніць выцёк пары.

Побач з разьгільдзямі ёсьць машыністыя, якія заслугоўваюць высокага званьня сапраўднага гаспадара-ўдарніка. Машыністы Благавешчанскі—(паравоз Э—30), Паліцан і Шпаноўскі—(паравоз С—56) і Дзерабін А.—(паравоз Э—6024) у зусім кароткі тэрмін прывялі паравозы ў спраўны і добры выгляд. Ударнікі далі ўзор прыкладнай працы па аздараўленьню паравоза.

Усім астатнім трэба па іх раўняцца.

Фонсі.

Даю прапанову

Брыгада строгальшчыкаў дэпо ня мае цьвёрдага графіка, з-за чаго часта здараецца, што ў адну зьмену выходзіць па 3—4 строгальшчыкі, а ў другую зьмену ніводны. У выніку недарэчнасьці, замест строгальшчыкаў адміністрацыі дэпо прыходзіцца ставіць токара, затрымліваць рамонт паравозаў. Зьняцьце з працы токараў дрэнна адбіваецца на выкананьні праграмы.

Прапаную зрабіць графік так, каб усе маючыяся строгальшчыкі былі правільна разьмеркаваны паміж зьменамі. Гэтым мы ліквідуем звышмерныя брыгады і адрыў токараў ад сваёй непасрэднай работы і адначасова зьнішчым затрымкі паравозаў па віне мэханічнага цэху.

Строгальшчык.

Да суровай адказнасьці разьгільдзяя Баркевіча

18 сакавіка цягнік № 852 вышаў з Віцебску на Смаленск. На станцыі Завольша цягнік быў затрыман з-за таго, што адна букса загарэлася. Пры аглядзе аказалася, што ў двух буксах ня было фінцялей. Здарылася гэта выключна з-за нядбайных адносін да сваёй працы змазчыка Баркевіча, які перад адпраўкай цягніка не зрабіў, як трэба, падбіўку і не наліў змазкі.

Несваечасовая застаноўка цягніка магла пацягнуць за сабой крушэньне. Трэба моцна ўдарыць па разьгільдзяях, якія сваімі нядбайнымі адносінамі да працы ствараюць глебу для крушэньня.

Бараноўскі.

Працягваюць штурмаваць

Вучні ФЗВ станцыі Віцебск у адказ на заклік партыі аб аздараўленьні паравозаў і аб ліквідацыі прарываў на чыгуначным транспарце працягваюць штурм за аздараўленьне паравозаў. Агульны сход вучняў школы пастанавіў увесьці 3-зьменную працу па рамонту паравозаў, што дае скарачэньне прастояў паравозаў у рамонце ў тры разы. Для пасьпяховага выкананьня гэтага мерапрыемства перакінуты на вытворчасьць 28 асоб, якія ўліты ў брыгады выпускной групы, працуючай на паравозе.

Гэтыя мерапрыемствы даюць значныя вынікі ў пасьпяховай ліквідацыі прарываў на вузьле і ў той-жа час не парушаюць нармальнага выкананьня навучальных плянаў школы, бо на гэты час складзены спэцыяльны расклад тэарэтычных заняткаў таксама на тры зьмены.

Н. У.

Зьнішчыць паўторнасьць у кацельнай

Заўсёды, як толькі паўстае пытаньне аб цечы дымагарных труб паравозу, дык знаходзіцца вельмі многа прычын. Сюды ўваходзяць: дрэнныя адносіны паравозных брыгад, недабраякасная праца качагараў пры запраўцы і чыстцы паравоза, дрэнны рамонт і г. д.

У апошні час высунуты лёзунг для кацельнай брыгады: «За лепшую развальцоўку і абчаканку бартоў дымагарных труб». Якасьць рамонту залежыць ня толькі ад кацельшчыкаў, але і ў значнай меры ад якасьці інструмэнтаў, якімі працуюць кацельшчыкі, у прыватнасьці ад вальцовак.

Трэба канстатаваць, што правільнасьць вальцоўкі ніколі не правяраецца і шаблоны для іх праверкі адсутнічаюць, а між тым, яны маюць вэраг дэфэктаў, якія патрэбна хутка зьнішчыць, па-першае, конусы камней не адпавядаюць конусу стрыжаня і пагэтаму разьвальцоўка атрымоўваецца не цыліндрычная, а конусная, па-другое, у адной і тойжа вальцоўцы можна сустрэць камні розных конусаў.

Гэта бывае ад таго, што пры замене камня інструмэнтальшчык ня лічыцца з тым, што магчыма гэты камень рабіўся зусім да другой вальцоўкі, у якой конус больш альбо менш.

Зразумела, што такая вальцоўка пры працы будзе каробіць трубу ва ўсе бакі і ніколі ня дасьць правільнай развальцоўкі. Трэба прапрацаваць гэтае пытаньне і вызначыць сталы стандарт.

Усе стрыжані вальцовак і камні павінны мець адкольканы конус. Трэба зьвярнуць увагу на прапанову кацельшчыкаў і зрабіць пяцілікавыя вальцоўкі для паравозных труб. Гэта ў значнай меры палепшыць працу і яе якасьць.

А. Тоцкі.

Даць па руках Сямёнавым

Дэпо Магілёў зрывае спараную язду. Калі віцебская паравозная брыгада на чале з машыністым Кулеш на паравозе № 480/2 накіравалася ў Магілёў, і рашыла скарыстаць толькі 2 гадзіны свайго адпачынку з тым, каб на сваім-жа паравозе ехаць назад дык дзяжурны па дэпо Сямёнаў, супроць гэтага запратэставаўшы, адправіў з гэтым паравозам другую брыгаду. З за гэтага брыгада Кулеша, прымацаваная да гэтага паравоза, прымушана была адправіцца ў якасьці пасажыраў.

Трэба адзначыць, што дэпо Магілёў часта практыкуе такія «справы».

За зрыў спаранай язды трэба моцна даць па руках.

Ш.

Трэба разударыць

Ударная брыгада аўтагэншчыкаў на чыгунцы ў момант працы, з вытворчага матар'ялу выконвае прыватныя падрады. Так, яна зрабіла зваркай труб сіроцінскаму млыну. Гэты выпадак не адзін і ім у сучасны момант займаецца спэцыяльная камісія. Але цікава, чаму гэтага ня бачыла адміністрацыя і МК, пад носам якіх тварыліся гэтыя брыдкасьці? Брыгаду аўтагэншчыкаў трэба разударыць.

П—роў.

БЮРАКРАТЫ ГЛУШАЦЬ РАБОЧУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ

Адміністрацыя дэпо ст. Віцебск ігнаруе рацыяналізатарскія прапановы рабочых. З 55 рабочых прапаноў, паступіўшых за 1930 год, выканана толькі 26. Адносіны да прапаноў вельмі брыдкія. Тэрміны не захоўваюцца і адміністрацыя не паведамляе рабочых аб лёсе іх прапаноў. Як вынік гэтага, у апошні час назіраецца слабае паступленьне прапаноў. Адсутнічае чуласьць да вынаходцаў. Так рабочы Рачнаў вынайшоў спосаб аўтагэннай зваркі сьвёрлаў, што дае значную эканомію, але-ж гэтым вынаходзтвам ніхто ня зацікавіўся і адміністрацыя параіла яму падаць заяву. Толькі ўмяшацельства інструктара масавай работы рамонту прымусіла бюро рацыяналізацыі зацікавіцца гэтай справай.

З-за няўважлівасьці адміністрацыі да працы расьце паўторнасьць рамонту. Так, за сьнежань і студзень па арматурнай брыгадзе было 120 паўторнасьцяй, па гарнітурнай—66, таварнай—721 паршнявой—126. Працдысцыпліна ў дэпо кульгае. Меры выхаваўчага характару амаль зусім не дапасоўваюцца. Адсутнічаюць чорныя і чырвоныя дошкі. Газэта «Паравозьнік» дрэнна працуе, не адбівае жыцьця дэпо і не мабілізуе рабочых на ліквідацыю прарываў. Рабочыя выкарыстоўваюцца бясплянава, а ў плянава-папераджальным рамонце, у брыгадах, з-за бясплянавасьці ў вячэрнюю зьмену выходзіў адзін чалавек. Маюцца выпадкі, калі ра очы, адпрацаваўшы да 3 х гадзін уначы, зноў выходзіць на працу ў 8 гадзін раніцы. Вылучаная УЧК 8 і аддзелам кадраў МББ чыг. брыгада, падкрэсьліўшы гэтыя моманты, пастанавіла прыцягнуць да адказнасьці адміністрацыю дэпо.

Сімр.

Хто вінаваты ў гэтым?

[illegible]га сакавіка на паравозе [illegible], 7-га сакавіка на паравозе С-53 і С-19|1 былі ўпушчаны трубы. Авроч гэтага, на паравозе № 19 1 трэснула 20 анкерных балтоў.

Паўторнасьць рамонту ўвесь час спыняецца. Паравоз С-56 тры разы запісаны ў кнігу дэфектаў, для замацаваньня дымавой каробкі з рамай Паравозы С-21 і С-19|1 запісаны 6 разоў, для правядзеньня аднаго толькі рамонту (масьленікі Фрыдмана), але справа далей запісу не пайшла.

Трэба выкрыць вінаватых.

Той-самы.

Скарыстаць вопыт цягніковых трыкутнікаў

У сваім руху ўперад цягнік сустракае дзесяткі і сотні прыпынкаў. Гэтыя прыпынкі часта не перамагаюцца, ніхто гэтым сур'ёзна не займаецца і ў выніку зрыў расьпісаньня цягнікоў, невыкананьне вымернікаў і інш. Лінейныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі зусім ня цікавяцца праходзячымі цягнікамі, ня ўмешваюцца, калі гэтыя цягнікі прастайваюць лішні час на станцыях, не дапамагаюць паравозным і кандукторскім брыгадам.

Чыгуначнікі ст. Сарціровачная Казанскай чыг. высунулі новую форму арганізацыі працы і заяясьпечаньня партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва на транспарце. Яны высунулі ідэю стварэньня рухаючагася трыкутніка ў цягнікох. Вопыт праведзены імі ў цягніку № 986 даў вельмі добрыя вынікі. У цягніку быў створаны трыкутнік у складзе парторга (машыніст), адміністратара (гл. кандуктар) і прадстаўніка прафарганізацыі. Наяўнасьць трыкутніка ў цягніку забясьпечыла пасьпяховае прасоўваньне яго, выкананьне расьпісаньня, адхіленьне прыпынкаў у пуці.

Якія задачы ставяцца перад цягніковым трыкутнікам? Пакажам асноўныя.

Першая—змагацца ў пуці супроць прыпынкаў, перашкаджаючых руху цягнікоў (незакончыя стаянкі, затрымка з наборам вады апалу і інш.).

Другая—рашуча змагацца за ажыцьцяўленьне графіка руху цягнікоў. Адхіляць так званыя «аб'ектыўныя» прычыны.

Трэцяя—заўсёды сачыць за спраўным становішчам саставу (паравоза, вагонаў, тармазоў і інш.).

Чацьвертая—дабіцца жорсткайдысцыпліны ўсіх саправаджаючых цягнік, патрабаваць адказнасьці ад кожнага, перасякаць спробы зрыву работы (п'янства, сон, грубасьць з пасажырамі).

Карацей кажучы, у цягніку будуць спэцыяльныя людзі, задача якіх ня толькі фіксаваць недахопы, але і адхіляць іх і забясьпечыць нармальнасьць руху.

Вопыт цягніковага трыкутніка, падтрыманы газэтай «Гудок», зараз распаўсюджваецца па ўсіх дарогах.

Кляса-за-чуждыя элемэнты, зразумела, выступаюць супроць гэтай ідэі і імкнуцца сарваць работу трыкутнікаў. Гэта трэба загадзя ўлічыць.

У радзе вузлоў трыкутнікі ў цягніках стварылі насьпех, недастаткова праінструктавалі таварышоў, нясур'ёзна падыйшлі к вылучэньню парторга.

Ясна, што і вынікі атрымаліся дрэнныя. Трэба будзе ў далейшым узяць цьвёрды курс на тое, каб вылучыць сталага парторга з складу паравознай брыгады. Увядзеньне спаранай язды палягчае гэтае зрабіць. Прафоргі павінны загадзя абірацца на сходзе кандукторскай і паравознай брыгад. Такі падыход забясьпечыць стварэньне працаздольных, энэргічных цягніковых трыкутнікаў і зьявіцца новай формай вырашчваньня актыву.

Цягніковыя трыкутнікі большай часьцю ствараюцца на пасажырскіх цягніках. Трэба стварыць іх абавязкова і на таварных. У бліжэйшыя дэкады мы павінны дабіцца, каб ня было цягнікоў бяз трыкутнікаў. Трэба адначасова патрабаваць ад усіх станцый аказваць трыкутнікам поўную падтрымку.

Цягніковыя трыкутнікі павінны дапамагчы ажыцьцявіць зварот партыі і ўраду і аздаравіць транспарт.

Дзесяць год новай эканамічнай палітыкі

1921—31 годы (гістарычная справка)

21 сакавіка 1921 г. УсеЦВК пастанавіў замяніць харчовую і сыравінную разьвёрстку натуральным падаткам, з пакіданьнем усіх запасаў харчоў, сыравіны і фуражу, застаючагася у земляробаў пасьля выкананьня імі падатку, у поўным іх распараджэньні. Пытаньне аб замене разьвёрсткі прадпадаткам і, значыцца, аб пераходзе к новай эканамічнай палітыцы ў 1921 г ўпяршыню была ўзьнята на паседжаньні палітбюро ЦК УсеКП(б) 8-га лютага 1921 г. пры абгаварэньні дакладу «аб пасеўнай кампаніі і становішча сялянства» Для выпрацоўкі пастановы аб палепшаньні становішча сялян к прадстаячаму 10 му зьезду партыі была створана камісія, якой Ленін прапанаваў наступныя мерапрыемствы: 1. «Задаволіць жаданьне беспартыйнага сялянства аб замене разьвёрсткі (у сэнсе выняцьця лішкаў) хлебным падаткам 2. Зьменшыць разьмер гэтага падатку ў параўнаньні з леташняй разьверсткай. 3. Ухваліць прынцып адпаведнасьці разьмера падатка з старанасьцю земляроба ў сэнсе паніжэньня процанта падатку пры павышэньні старанасьці земляроба. 4. Пашырыць свабоду скарыстаньня земляробам яго лішкаў звыш падатку ў мясцовым гаспадарчым звароце, пры ўмове хуткага і поўнага ўнясеньня падатку».

Дакумант, зьмяшчаючы гэтыя прапановы, азаглаўлены Леніным «Папярэдні чарнавы набросак тэзісаў наконт сялянства», хаваецца ў архіве інстытуту Леніна. 7 сакавіка 1921 г. ЦК РКП(б) зацьвердзіў пастанову аб замене разьвёрсткі прадпадаткам, пасьля чаго канчаткова зрэдагаваная гэтая пастанова была ўнесена на 10-ы зьезд РКП(б) у якасьці рэзалюцыі падакладу Леніна аб замене разьвёрсткі прадпадаткам і прынята зьездам 15-га сакавіка 1921 году. Усьледам за тым 21-га сакавіка 1921 г. пастанова аб замене прадразьвёрсткі натуральным падаткам была прынята УсеЦВК. У дэкрэце, прынятым УсеЦВК, гаварылася: «для забясьпечаньня правільнага і спакойнага вядзеньня гаспадаркі на аснове больш свабоднага звароту земляробчымі прадуктамі сваёй працы і сваімі гаспадарчымі сродкамі, для ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі і ўзьняцьця яе вытворчасьці, таксама ў мэтах точнага ўстанаўленьня падаючых на земляроба дзяржаўных абавязкаў, разьвёрстка, як спосаб дзяржаўнай загатоўкі харчовай сыравіны і фуража, заменьваецца натуральным падаткам. Усе запасы сыравіцы, харчоў і фуражу, застаючыяся ў земляроба, пасьля выкананьня ім падатку, знаходзяцца ў поўным яго распараджэньні».

Вопыт сацыялістычнага будаўніцтва на рэйках нэпа і прайшоўшыя 10 год поўнасьцю пацьвердзілі клясычнае ленінскае зазначэньне сутнасьці нэпа, дадзенае Сталіным. Нэп,- гаварыў Сталін,- ёсьць асобая палітыка пралетарскай дзяржавы, разьлічаная на дапушчэньне капіталізму пры наяўнасьці камандных высот у руках пралетарскае дзяржавы, разьлічаная на барацьбу элемэнтаў капіталістычных і сацыялістычных, разьлічаная на ўзрастаючай ролі сацыялістычных элемэнтаў ва ўшчэрб элемэнтам капіталістычным, разьлічаная на перамогу сацыялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі элемэнтамі, разьлічаная на зьнішчэньне клясаў і пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Хто не разумее гэтай пераходнай двойсьцьвеннай прыроды нэпа, тэй адходзіць ад ленінізму». У выніку пасьлядоўнага правядзеньня гэніяльнага ленінскага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, рабочая кляса, працоўныя СССР пад кіраўніцтвам УсеКП(б), дабіліся за мінулыя 10 год нэпа рашаючых посьпехаў па ўсяму фронту барацьбы за сацыялізм.

За прайшоўшыя 10 год народны прыбытак СССР узрос ў чатыры разы, валавая прадукцыя прамысловасьці ўзрасла ў 12½ раз, даваенны ўзровень разьвіцьця прамысловасьці, ў адносінах да якога прамысловасьць у 1921 годзе ледзь дасягнула 20 проц., у цяперашнім 1931 годзе будзе перавышан у тры разы, лік індустрыяльных рабочых за 10 год узрос з 2 млн. 430 тысяч да 6359 тысяч чалавек, уся пасеўная плошча ўзрасла за гэтыя 10 год у паўтара разы, ужо ў бягучым годзе калгасы ахопяць ня менш паловы ўсіх сялянскіх гаспадарак нашай краіны і, умесьце з саўгасамі, забясьпечаць абсалютную перавагу сацыялістычных элемэнтаў над індывідуальнымі сэктарам у вёсцы. Груза зварот чыгуначных дарог за 10 год павялічыўся больш, чым у шэсьць разоў, таваразварот—у 5½ разоў і г. д. Тое, што мы ўжо ў бягучым годзе завяршаем пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, поўнасьцю пацьвярджае правільнасьць ленінскага прагнозу аб тым, што ў пэрыяд нэпу ў выніку правільнай палітыкі наступіць такое паскораньне руху, «аб якім мы зараз і марыць ня можам».

У цяперашні час СССР уступіў у пэрыяд сацыялізму і адначасова ў апошні пэрыяд нэпа. Завяршэньне сацыяльнай калектывізацыі СССР і ліквідацыя на гэтай аснове кулацтва, як клясы і далейшае разьвіцьцё сацыялістычнай прамысловасьці сельскай гаспадаркі намечанымі тэмпамі вядуць нас да завяршэньня апошняга пэрыяду нэпа к поўнай ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў у нашай гаспадарцы, к поўнай і канчатковай перамозе сацыялізму ў СССР.

Што бачылі нямецкія работніцы на лесазагатоўках у Карэліі

У Карэлію прыяжджаюць дзьве тысячы канадзкіх лесарубаў

Дэлегацыя нямецкіх работніц, наведаўшая лесазагатоўкі ў Карэліі, апублікавала заяву, якую прыводзім у вытрымках:

«Мы бачылі,—пішуць яны,—увесь працэс лесных работ—валку, расьпілку, падвозку леса трактарным трасам і перавозку на трактарах да лясных бірж. Мы былі ў рабочых бараках, рабочых сталовых і ў чырвоных кутках. Усюды мы размаўлялі з рабочымі як з прыезжымі з Канады лесарубамі, так і з карэльскімі і рускімі. Мы ўпэўніліся на фактах і з размоў з рабочымі, што аб прымусовай працы на лесараспрацоўках Карэліі ня можа быць і слоў. Рабочыя Канады запэўнілі нас, што яны ў Савецкім саюзе бачуць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну. Яны гаварылі, што толькі ў СССР яны пачулі сябе свабоднымі людзьмі. Яны ўсе сталі ўдарнікамі сацыялістычнага будаўніцтва. Большасьць з іх уступае ў кампартыю. Яны паведамілі, што запрасілі сваіх таварышоў з Канады прыехаць у Савецкі саюз —адзіную краіну, дзе рабочая кляса ня ведае рабскае працы, а свабодна будуе лепшае жыцьцё. Па іх запрашэньню ў Карэлію прыяжджае дзьве тысячы лесарубаў з Канады. Мы ўсюды бачылі здаволеныя, радасныя твары, бадзёрую, ўдарную работу. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, энтузіязм у сацыялістычным будаўніцтве—вось асноўныя рухавікі ў рабоце лесарубаў, а ня «прымусовая праца», выдуманая ворагамі Савецкага саюзу».

Сваечасовы пуск Магнітабуду і Кузьнецкбуду—справа гонару кожнага бальшавіка

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГ СССР абгаварвалася пытаньне аб ходзе выкананьня заказаў Магнітабуду і Кузьнецкбуду на абсталяваньне. Выкананьне гэтых заказаў ідзе з рук вон дрэнна. Ні аб'яднаньні, ні заводы пастаўшчыкі не ўдзяляюць гэтай важнейшай задачы павіннай увагі.

Па ходу выкананьня пляну будаўнічых работ пуск першай чаргі Магнітабуду забясьпечаны намечаныя тэрміны Але гэтыя тэрміны могуць быць сарваны, калі ня будуць прыняты рашучыя і тэрміновыя меры для ўпарадкаваньня пастаўкі абсталяваньня, палепшаньня транспарту, забясьпячэньня матарыяламі і спэцыялістымі.

Неабходна,—заявіў т. Орджанікідзе,—безагаворачна вытрымаць устаноўленыя партыяй і ўрадам тэрміны пуску першай чаргі Магнітабуду і Кузьнецкбуду. Мы будуем і пабудуем Магнітабуд і Кузьнецкбуд. На дапамогу гэтым важнейшым будоўлям павінны прыйсьці, у першую чаргу, родсьцьвенныя паўднёвыя металязаводы. На гэтую-ж мэту трэба мабілізавацца ўсім аб'яднаньням. Сваечасовы пуск двух гігантаў нашай індустрыі—справа гонару кожнага бальшавіка.

Энэргічна падрыхтавацца да 1-га тыражу пазыкі «5-годку ў 4 гады»

ЦК садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправы пры ЦВК СССР прапанаваў усім камсодам разгарнуць энэргічную падрыхтоўку да прадстаячага 8 красавіка першага тыражу пазыкі «пяцігодка». Трэба шырока інфармаваць працоўных аб неабходнасьці абмяняць ца тыражу аблігацый 1-й і 2-й пазыкі індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на пазыку «Пяцігодка».

Рэкорд галавацяпства

Абсьледавацельская рабочая брыгада УсеЦСПС устанавіла рад брыдкасьцяй на маскоўскім заводзе «Чырвоны Багатыр». Так, з 1929—30 гаспадарчага году на заводзе практыкавалася ўтрыманьне з зарплаты рабочых у фонд зьніжэньня сабекошту. Гэтае недапусьцімае скажэньне партыйных, урадавых і профсаюзных дырэктыў заўком аформіў па грамадзкай лініі. У дагаворах па сацспаборніцтву былі ўключаны пункты аб адпрацоўцы паасобнымі брыгадамі 20 пар галёш, ці аб адлічэньні з зарплаты 3 проц. у фонд зьніжэньня сабекошту. Усяго та кім чынам было сабрана ў працягу 1929—30 году і ў асобым квартале звыш 16 тысяч руб.

Раённая РСІ прапанавала завода кіраўніцтву безадкладна зьвярнуць грамадзкім арганізацыям гэтыя грошы для скарыстаньня іх на гароды і дзіцячыя ясьлі.

Рэзкае абвостраньне клясовай барацьбы ў Нямеччыне

Паглыбленьне эканамічнага крызісу, рост беспрацоўя, генэральны наступ нямецкіх капіталістых на зарплату рабочых,—усё гэта выклікае рост рэвалюцыйнага руху ў радох нямецкага пралетарыяту і прыводзіць к крайняму напружаньню клясавай барацьбы.

Начальнік берлінскай паліцыі сацыял-дэмакрат Грэзінскі забараніў на нявызначаны тэрмін усе сходы і дэманстрацыі пад адкрытым небам. Гэтая забарона накіравана выключна супроць рабочых дэманстрацый і ў першую чаргу супроць раду дэманстрацый, намечаных пралетарскімі рэвалюцыйнымі арганізацыямі. Забаронены назначаны на 5 га красавіка агульна-нямецкі зьлёт моладзі ў Берліне.

Адначасова прускі міністр унутраных спраў сацыял-дэмакрат Зеверынг разаслаў усім паліцэйскім органам Прусіі цыркуляр, у якім прапанае паліцыі дзейнічаць больш рашуча. У адказ на ўзмацненьне рэпрэсій нямецкія рабочыя з новай сілай дэманструюць супроць фашызму і яго сацыял дэмакратычных лёкаяў.

У Дзюсельдорфе (Рурская абласьць) наўпрокі забароны, адбылася магутная анты-фашысцкая дэманстрацыя. На калёну дэманстрантаў, накіроўваўшуюся з аднаго з прадмесьцяў Дзюсельдорфу к цэнтру горада, раптам напаў моцны атрад паліцыі і без усялякага папярэджэньня адкрыў па дэманстрантах агонь з вінтовак. Адзін рабочы забіты, адзін сьмяротна паранены.

Крывавы тэрор паліцыі выклікаў настолькі моцнае абурэньне сярод рабочых, што к вечару горад быў абвешчан на асадным становішчы. Вытвараны масавыя арышты.

ЦК нямецкага камсамолу ў адказ на забарону агульна-нямецкага зьлёту моладзі выпусьціў адозву, у якой паведамляе, што ўзамен забароненага зьлёту, камсамол правядзе 3—4 красавіка 4 агульна-нямецкіх зьлёты моладзі.

Масавыя рабочыя дэманстрацыі ў дзень Парыскай камуны

ВАРШАВА, 19. У сувязі з гадавінай Парыскай камуны, у розных раёнах Варшавы адбыліся рабочыя дэманстрацыі. На плошчы Пілсудзкага рабочыя арганізавалі контр-дэманстрацыі супроць фашысцкіх урачыстасьцяй па выпадку імянін Пілсудзкага. Усюды супроць дэманстрантаў выступала паліцыя. Вытвараны шматлікія арышты.

Рабочыя ў Амэрыцы галадаюць

ХЭРСОН, 19. На 8-тысячны рабочы калектыў заводу імя Пятроўскага меў вялікае ўражаньне ліст, атрыманы ад былога рабочага гэтага заводу т. Паплаўскага з Амэрыкі. У сваім лісьце Паплаўскі расказвае аб жыцьці амэрыканскіх рабочых ва ўмовах нячуванага крызісу. Ён служыць памоцнікам машыністага на аграмадным машынабудаўнічым заводзе, але ўжо звыш году працуе два дні ў тыдзень.

«Дарагія пятроўцы, — піша т. Паплаўскі,—калі-б вы толькі бачылі, якія аграмадныя чаргі за хлебам стаяць у нас у багатай Амэрыцы. Тут некаторыя благатварыцельныя т-вы адкрылі сталовыя для галадаючых. Каля гэтых сталовых з раніцы да позьняга вечара стаяць тысячы галодных людзей, каб атрымаць кружку чорнага кофэ бяз цукру і кавалак хлеба, ды і нямногім выпадае гэтае шчасьце. Хто паслабей—той і гэтага не атрымоўвае. Часта адбываюцца бойкі паміж галоднымі і тады зьяўляюцца палісмэны. Яны «наводзяць парадак», зьбіваючы галодных рабочых дубінкамі.

Зьбілі стэнаграфістак

ТОКІО, 19. Як паведамляе агэнцтва «Сімбун-Ренго», учора вечарам у ніжняй палаце парляманту ў час перапынку паседжаньня група членаў партыі Сейюкай, не зьяўляючыхся членамі парляманту, накінуліся на парляманцкіх стэнаграфістак, абвінавачваючы іх у тым, што яны скажаюць пратаколы паседжаньняў парляманту. Зьбіеньне стэнаграфістак працягвалася, пакуль яны ня страцілі прытомнасьць, пасьля чаго іх прышлося адвезьці ў бальніцу.

ТОКІО, 19. Сёньня раніцай паседжаньні палаты пэраў было перарвана ў выніку забастоўкі парляманцкіх стэнаграфістак, абвешчанай у знак пратэсту супроць іх зьбіеньня.

Даць адпор белагвардзейскім бандам

БЭЙПІН, 18. Па паведамленьні з Харбіна, кіраўнік Кіт.-Усх. чыг. т. Руды зьвярнуўся ў праўленьне з дакладам, у якім пералічвае выпадкі нападу за апошні час хунхузкіх шаек і іншых узброеных груп на станцыі Кіт.-Усх. чыг. і чыгуначных служачых. У дакладзе адзначаюцца таксама незаконныя дзеі чыноўаховы войск.

Кіраўнік дарогі просіць праўленьне прыняць меры да агароджаньня тэрыторыі Кіт.-Усх. чыг. і яе служачых ад розных налётаў, незаконных дзей і гвалту, стваравочых пагрозу нарушэньня нармальнай работы на Кіт.-Усх. чыг.

У Мадрыдзе адбываюцца хваляваньні

ПАРЫЖ, 18. «Гавас» паведамляе, што ў Мадрыдзе адбыліся магутныя дэманстрацыі студэнтаў, мэдыкаў і юрыстых. Адбываюцца шматлюдныя дэманстрацыі ў розных раёнах краіны. У радзе гарадоў бастуюць рабочыя.

ВЫШЭИ УДАРНІЦТВА У ШЭРАГАХ РАБКОРАУ

ЗАЖЫМШЧЫКАЎ САМАКРЫТЫКІ, НЕ РЭАГУЮЧЫХ НА ЗАМЕТКІ Ў ДРУКУ, НА ЛАВУ ПАДСУДНЫХ

Па бальшавіцку змагацца за канкрэтныя задачы

Усесаюзная нарада па пытаньнях рабселькораўскага руху падвяла вынікі дасягненьням і недахопам, маючымся ў нас на гэтым вучастку работы.

За апошнія гады рабселькораўскі рух мае вялічэзныя посьпехі: у 1928 годзе па ўсяму Савецкаму саюзу налічвалася 500 тысяч рабселькораў, а зараз іх два з лішнім мільёны. Насьценгазэт было 60 тысяч, а цяпер 250 тысяч. Друкаваныя завадзкія газэты за тыя-ж два гады вырасьлі больш, чым у сем разоў.

Узмацніла я арганізуючая роля рабселькораў, як перадавых барацьбітоў за сацыялізм. Як на вытворчасьці, так і ў друку шырока разьвіваецца ўдарніцтва.

Рабкор—ударнік і селькор — калгасьнік становяцца цэнтральнымі фігурамі рабселькораўскага руху.

На мясцох накапіўся багацейшы вопыт пастаноўкі масавай рабселькораўскай работы, аўладаньня друкам бальшавіцкімі тэмпамі і высокай апэрацыйнасьцю ў барацьбе за генэральную лінію партыі, у сацыялістычным наступе па ўсяму фронту.

Дасягнутыя посьпехі нашчэнт разьбілі праваапартуністычныя ўстаноўкі, якія спрабавалі навязаць рабселькораўскаму руху на IV усесаюзнай нарадзе рабселькораў правыя апартуністы і малаверы (Бухарын і г. д.).

Усесаюзная нарада з усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю разаблачыла гэтыя ўстаноўкі і дала рашучы адпор праяўленьням правага апартунізму (Ландаў і інш.), недаацэньваючым сілу і значэньне ўдарніцтва ў друку, а таксама «левым» загібшчыкам, не ўдзяляючым павіннае ўвагі рабселькору-адзіночцы.

Нарада ўскрыла рад недахопаў у рабселькораўскім руху. Многія фабрычна-завадскія і калгасныя газэты яшчэ не спраўляюцца з пытаньнямі барацьбы на два фронты. Не хапае ў іх апэрацыйнасьці, масавасьці і бальшавіцкіх тэмпаў. Недастаткова шырока прымяняецца практыка грамадзкага буксіру, перапача вопыту перадавых рэдкалегій, шэфства рабкораў над селькорамі.

Рад завадзкіх і калгасных газэт не вядзе сыстэматычнага асьвятленьня такіх пытаньняў, як работа саветаў, абарона краіны і інш. Успамінаюць аб іх толькі ў дні кампаній і гадавін.

Прычынай паказаных недахопаў зьяўляецца недастатковая праверка выкананьня нізавымі партарганізацыямі неаднаразова даваўшыхся партзьездамі і ЦК партыі дырэктыў аб парткіраўніцтве рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.

У мэтах далейшага ўзмацненьня парткіраўніцтва нарада рашыла:

«Разгортваць бязьлітасную барацьбу з недаацэнкай нізавога (ў прыватнасьці—цэхавага) друку, як з адной з форм праяўленьня правага апартунізму на практыцы, забясьпечыўшы на справе ўзмацненьне непасрэднай адказнасьці мясцовых партарганізацый за становішча нізавога друку і рабселькораўскіх арганізацый».

Нарада паставіла перад усім друкам пытаньне аб пераходзе на ўдарныя мэтады работы, аб пагалоўным уцягненьні рабселькораў у сацыялістычнае спаборніцтва, і больш рашучым уцягненьні новых колаў рабочых і працоўных у рабселькораўскі рух.

Наступная чарговая задача — максымальнае ўзмацненьне палітыка-выхаваўчай работы сярод рабселькораў, як шляхам пастаноўкі работы саміх ударных брыгад у друку, так і ўцягненьня рабселькораў у агульную сетку партасьветы і ахопу іх рознымі курсамі.

У адказ на заклік т. Сталіна павярнуцца «тварам да тэхнікі», усесаюзная нарада абвясьціла усесаюзны рабселькораўскі паход за аўладаньне тэхнікай.

Рашэньні ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху маюць аграмаднае палітычнае значэньне, і задача ўсіх арганізацый забясьпечыць поўнае правядзеньне іх у жыцьцё.

Рабкоры, на штурм прарыву

Нядаўна на акулярнай фабрыцы адбыўся агульны сход рабкораў па пытаньні аб ліквідаваньні вытворчага прарыву. Ня гледзячы на невялікую колькасьць прысутнічаўшых (30—35 асоб), сход прайшоў вельмі актыўна і паказаў, што рабкоры акулярнай фабрыкі здольны і будуць упарта змагацца за ліквідаваньне прарыву на фабрыцы. У шырока разгарнуўшыхся спрэчках выказаліся амаль усе прысутнічаўшыя, якія выявілі шмат ненармальнасьцяй, перашкаджаючых наомальнаму выкананьню прамфінпляну. Выказаўшыяся таварышы яскрава падкрэсьлілі, што невыкананьне прамфінпляну на фабрыцы выключна залежыць ад дрэннага кіраўніцтва з боку адміністрацыйнага пэрсаналу цэхаў, падзеньня працоўнай дысцыпліны, а таксама, амаль поўнай адсутнасьці партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва ў цэхах.

Значная віна ў невыкананьні прамфінпляну кладзецца на шматтыражку „Чырвоная акулярніца", якая ня здолела мабілізаваць рабочыя масы на барацьбу за 100-процантнае выкананьне прамфінпляну, не вяла барацьбы з прагульшчыкамі і лодырамі, не складала вакол іх адпаведнай грамадзкай думкі.

З спрэчак высьветлілася, што брак дасягнуў вялікай колькасьці. Інструктары цэхаў ня прымаюць захадаў да яго папярэджаньня і гэткі ў большасьці праходзіць усе стадыі апрацоўкі і бракуецца на апошнім працэсе.

Амаль зусім адсутнічае сацспаборніцтва і ўдарніцтва і вучоту яго ніякага не вядзецца. Партыйцы і камсамольцы ў значнай меры не ахоплены ўдарніцтвам, на фабрыцы налічваецца ва ўдарных брыгадах і індывідуальных ударнікаў усяго 40 партыйцаў і 29 камсамольцаў. Прагулы дасягнулі вялікіх разьмераў і за адзін месяц колькасьць іх выражаецца ў 312 рабочых дней. Есьць выпадкі прагулаў з боку інструктараў і нават адзін з іх ухітрыўся прагуляць 7 дзён падрад. З-за нераспараджальнасьці адміністрацыі 150 рабочых касьцюмаў гніюць, зложаныя ў груду толькі з-за таго, што іх быццам недзе памыць, а ў гэты час рабочыя адчуваюць недахоп у спэцвопратцы. Варштаты сваечасова не рамонтуюцца.

Рабкоры акулярнай фабрыкі намецілі шэраг практычных мерапрыемстваў па палепшаньні працы і абвясьцілі сябе мабілізаванымі на ліквідаваньне прарыву, пасганавіўшы тэрмінова скласьці ва ўсіх цэхах рабкораўскія брыгады і пасты, якія сваечасова сыгналізавалі-б аб усіх перашкодах на шляху выкананьня прамфінпляну і непасрэдна прымалі захады да іх зьнішчэньня. Сход прапанаваў рэдакцыйнай тройцы на момант штурму выпусьціць спэцыяльную лістоўку, якая-б дэталёва асьвятляла ход штурму прарываў, скласьці ў больш буйных цэхах рэдкалегіі, аформіўшы іх на агульных цэхавых сходах і выпусьціць насьценныя газэты па цэхах, абвясьціць рашучую барацьбу браку, палепшыць дагляд за варштатамі. Пры газэце «Чырвоная акулярніца» арганізаваць спэцыяльны куток „тэхніка ў масы", практыкаваць мэтад пераклічкі рабкораўскіх брыгад паміж цэхамі, выкарыстоўваючы для гэтага абедзенныя перапынкі, уцягваць у рабкораўскія шэрагі лепшых ударнікаў з вытворчасьці.

Шырока разгарнуўшы крытыку і самакрытыку, накіраваўшы яе вастрыё супроць разьгільдзяеў, лодыраў, рвачоў і прагульшчыкаў, супроць канкрэтных носьбітаў зла, рабочыя акулярнай фабрыкі ліквідуюць прарыў і дабіваюцца 100-процатнага выкананьня прамфінпляну па ўсіх яго паказальніках.

Лапціхоўскі.

„...МЕНАВІТА ТАМУ, ШТО ЎМЕНЬНЯ КІРАВАЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ НЕ ХАПІЛА, МЕНАВІТА ТАМУ ПЛЯН АКАЗАЎСЯ НЯВЫКАНАНЫМ" (СТАЛІН)

Арганізацыйныя непаладкі, самоцёк, безгаспадарчасьць адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прывялі к зрыву вытворчай праграмы

НЕАДКЛАДНА МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЮ РАБОЧУЮ МАСУ НА РАШУЧАЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЕ ЎСІХ НЕПАЛАДАК

АБУТКОВАЯ Ф-КА ІМЯ ЛЕКЕРТА Ў ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ АДСТАЕ

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, майстры, вытворчы сэктар нядбайна адносяцца да работы.

Буксірная брыгада ЦСПСБ, ВСНГ, ЦП саюзу скурнікаў і ЦК КСМ, прыяжджаўшая на фабрыку ім. Лекерта для праверкі выкананьня прамфінпляну і ліквідацыі прарываў, выявіла шэраг недахопаў у рабоце фабрыкі.

Рантавы цэх за першую пяцідзёнку сакавіка **выканаў 82,4 проц.** праграмы гатунковага абутку, за другую пяцідзёнку—**85 проц.** Вінтавы цэх за першую пяцідзёнку **выканаў 72 проц.** гатунковай, за другую пяцідзёнку **81 проц.**

Працоўная дысцыпліна на фабрыцы значна кульгае. Маюцца частыя выпадкі нявыхаду на работу, а фабком на вывучаў прычыны гэтага і ніякай растлумачальнай працы не праводзіў. Нягледзячы на тое, што маюцца рэзэрвныя машыны, яны не скарыстоўваюцца і калі псуецца якая небудзь машына, рабочы ня можа перайсьці на другую, бо яна няспраўная. Пры перадачы зьмен наглядаюцца няўважлівыя адносіны з боку майстраў у сэнсе перадачы ў няспраўным выглядзе варштатаў і інструмантаў. Адсутнічае арганізацыйная ўвязка ў рабоце цэхаў. Назіраецца слабы дагляд за расходваньнем матарыялаў, а таксама за хаваньнем палуфабрыкатаў.

Асаблівы прарыў маецца ў выпуску і якасьці школьнага абутку. Кольканае заданьне па школьнаму абутку выконваецца **ад 40 да 60 проц.**

Фабрыка перайшла да вырабу абутку з гранітолевымі заднікамі, але з-за адсутнасьці належнай увагі адміністарацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і майстраў да гэтай работы, маецца вялікі процант браку.

Нягледзячы на тое, што на ф-цы маецца 42 камуны, якія складаюцца з 242 рабочых і 6 брыгад, кіраўніцтва гэтымі камунамі амаль адсутнічае. Ніякай растлумачальнай работы і мабілізацыі камунараў на ліквідацыю прарываў не вядзецца, з за чаго многія камуны развальваюцца.

Вытворчы сэктар не перабудаваў сваю працу і ня цікавіцца станоўшчам вытворчасьці і рацыяналізацыі. На фабрыцы маюцца дзьве прасьцілачныя машыны, але яны не працуюць. Працуючая зараз брыгада, такі сама брыгады, вылучаныя па цэхам і зьменам, павінны накіраваць увагу ўсіх рабочых на зьнішчэньне ўсіх недахопаў, што перашкаджаюць выкананьню прамфінпляну.

Брыгада: **Ваговін, Пэўзьнер.**

„Ня ваша справа"

Адміністрацыя мэханічнага цэха **заводу «Чырвоны Мэталіст»** да гэтага часу не ўявіла сабе неабходнасьць рашучай барацьбы за выкананьне прамфінпляну. Прастоі на клёпцы рам для лябёдак сталі сыстэмай і гэта пагражае зрывам праграмы ўсяго цэху. Брыгада па клёпцы рам т. **Будо** 5-га сакавіка мела прастой ня менш як 1,5 гадз. з-за адсутнасьці крэставін. Брыгада **Блюмкіна** прыклёпвае кароткія плянкі к крэставінам і, ня гледзячы на тое, што адміністрацыя аб гэтым неаднаразова гаварыла, яна ніякіх мер не прыняла супроць гэтага.

Пасьля таго, як прагудзеў гудок і брыгада Будо павінна была пайсьці дамоў, загадчык цэхам т. **Тэвелеў** прапанаваў працягваць работу, а калі рабочыя пачалі супярэчыць, кажучы, што ім няма чаго заставацца, бо няма гатовых крэставін і што брыгада Шаўрова, якая прышла на зьмену будзе стаяць бяз справы, Тэвелеў заявіў: «ня ваша справа, работайце», і брыгада Будо работала дзьве з паловай гадзіны без аплаты, а брыгада Шаўрова гэты час разгульвала па цэху, кажучы: «нам ня важны прастой, бо мы атрымліваем па сярэдняму».

Калі праз некалькі дзён т. **Яршову** было сказана, што брыгада Блюмкіна сваечасова не нарыхтавала крэставін, ён адказаў: «вы яшчэ надта молады на заводзе і просім не паказваць».

Трэба напомніць цэхавай адміністрацыі аб элемэнтарных правілах увагі да рабочых прапаноў.

Збоеў П.

Рапарт газэце „Віцебскі Пралетары"

Ганебныя лічбы

Шліфавальны цэх за 3-цю пяцідзёнку даў 33 проц. праграмы

За трэцюю пяцідзёнку сакавіка акулярная фабрыка дала ганебныя лічбы.

Прамфінплян выканан на 52,1 проц.

Прадахраніцельны цэх выканаў 51 проц. праграмы. Ляжаць гатовыя рэспіратары з-за таго, што няма зажымаў. Ня выпускаюцца шофэрскія акуляры. Паламаны вальцы для нарэзкі ленты.

Шліфавальны цэх выканаў 33 проц. заданьня. Цэх фітцы выканаў 42 проц. Адсутнічаюць пераносіцы. Мэханічны несваечасова адрамантаваў варштаты для нарэзкі разьбы.

Становішча пагражальнае. Неабходна прыняць рашучыя меры да тых, хто злосна зрывае выкананьне прамфінпляну.

Роза

Манцёра ў цэху рэдка ўбачыш

На заводзе **«Камінтэрн»** маецца адзін электраманцёр—тав. Керп, які павінен наглядаць прыблізна за дзесяцью маторамі. Але тав. Керп, атрымліваючы вялікую пэнсію, зусім нядбайна адносіцца да работы. З-га сакавіка ў вялікім маторы згарэў падшыпнік з-за недахопу масла і першай зьмене прышлося адпраўляць свае гадзіны на трэцяй зьмене. На заводзе манцёра ніколі не ўбачыш да гудка і часта інструктарам прыходзіцца ўключаць і выключаць маторы.

Такія адносіны да вытворчасьці з боку т. Керпа, які зьяўляецца да таго-ж кандыдатам партыі, зусім недапушчальны.

Зубіла.

У выпраўдоме цкуюць рабкораў

У лютым у «Віцебскім Пралетары» быў зьмешчан артыкул аб ненармальнасьцях у працы выпраўдому і брыдкіх паводзінах начальніка выпраўдому **Лайзіна**. Камісія, якая расьсьледвала гэты артыкул поўнасьцю пацьвердзіла пака аныя там факты. Лайзін, даведаўшыся ад свайго памоцніка **Цярэнцева** аб тым, што аўтарам артыкулу зьяўляецца інструктар друкарні **Каган**, пачынае пыдзірацца, шукаючы прычыны для яго звальненьня. Бухгальтар выпраўдому **Хідэкель** на другі дзень пасьля зьмяшчэньня ў газэце артыкулу зьвярнуўся да Кагана з папярэджаньнем: табе трэба чакаць няпрыемнасьцяй з боку Лайзіна». І словы Хідэкеля апраўдаліся.

Пачалося з таго, што Лайзін даў Кагану вымову па справе, да якой ён ніколі ня быў прычасьцен. Калі складаўся калдагавор, Лайзін настаяў на тым, каб Кагану ня была набаўлена пэнсія, ня гледзячы на даведку саюзнай арганізацыі і на тое, што ўсім без выключэньня служачым пэнсія была дабаўлена. Пратэсты з боку старшыні мясцкому і загадчыка друкарні не дапамаглі. Калі разглядалася пытаньне аб прадастаўленьні дадатковага водпуску, Лайзін адмовіўся ўключыць у гэты водпуск друкарню, якая зьяўляецца самым шкодным прадпрыемствам з майстэрняў выпраўдому. У дадатковы да калдагавору сьпісак на спэцвопратку, друкары таксама ўключаны ня былі. Але гэта ня ўсё.

Аднойчы, прышоўшы вечарам у бухгальтэрыю, Каган сустракае там Хідэкеля, які гаворыць: «можаш чакаць звальненьня». На другі дзень быў вывешан загад, па якому Каган звальняецца з працы, як былы зьняволены.

Пытаньне аб звальненьні было перададзена ў РКК, дзе Лайзін заявіў, што звальняе Кагана выключна па той прычыне, што ён як былы зьняволены ня можа быць выхаваўцам зьняволеных. Звальненьне было зроблена нават без узгадненьня з гагадчыкам друкарні **Песачынскім**. Лайзін сам сабе супярэчыць, бо прыняў на працу двух былых зьняволеных **Іванова** і **Цырэльсона**, а таксама да гэтага часу ў бухгальтэрыі працуюць двое былых зьняволеных—**Хавемсон** і **Легэдзін**.

Выкліканы на паседжаньне РКК старшыня саюзу саўгандслужачых **Аўрускін** пацьвердзіў, што ніякіх падстаў для звальненьня Кагана няма. РКК да згоды з Лайзінам ня прышла і справа перададзена ў працоўную сэсію. Перад сканчэньнем паседжаньня РКК разэлаваны Лайзін заявіў: «я не дапушчу **Кагана** да працы нават і тады, калі мне загадае сам пракурор». Гэтыя словы як нельга лепш характарызуюць Лайзіна і яго мэту звальненьня Кагана. Ня гледзячы на тое, што ўся маса рабочых і служачых добра ведае гэтую справу, як справу цкаваньня рабкора, парт'ячэйка і мясцком ня думаюць у яе ўмешвацца.

Трэба тэрмінова разабраць гэтую справу і даць па руках Лайзіну, які цкуе рабкораў.

Рубікон.

Рэдкалегія сувязі не забясьпечвае разгортваньне самакрытыкі

Абсьледваньне дзейнасьці рэдкалегіі насьценгазэты працаўнікоў віцебскай канторы сувязі паказала, што газэта не зьяўляецца органам, які б сапраўды адбіваў жыцьцё калектыву, барацьбу за прамфінплян, за генэральную лінію партыі, супроць розных ухілаў. Газэта выдавалася нерэгулярна і зусім не асьвятляла праводзімыя палітычна-гаспадарчыя кампаніі. Яна не мабілізавала масу вакол задач, высоўваемых партыяй і ўрадам.

Рэдкалегія ня здолела разгарнуць сапраўдную бальшавіцкую самакрытыку, не зважаючы на асобы. Газэта, як па зьместу матарыялу, так і па форме, не разьлічана на чытку яе шырокімі масамі сувязістых. Большасьць заметак мае характар агульных разважаньняў, ёсьць шмат інструкцыйнага сухога матарыялу. Артыкулы не паказваюць канкрэтных носьбітаў зла. Пераважная колькасьць заметак пішацца пад псэўдонімамі, пры чым прозьвішчы маюцца толькі пад артыкуламі агітацыйнага, альбо агульнага характару. Крытыка і самакрытыка пры аглядзе нумараў за 1930 год не адчуваецца, а наадварот, мелі месца выпадкі заціску самакрытыкі з боку самой рэдкалегіі.

Так, рабкор т. **Бясьмертны** ў лютым 1930 г. быў саюзам вылучаны на паездку, як бухгальтар, у вёску для правядзеньня пасеўнай кампаніі, але адміністрацыя не згадзілася яго адпусьціць, пагражаючы звальненьнем.

Калі **Бясьмертны** напісаў аб гэтым заметку, дык рэдкалегія не адважылася яе прапусьціць, а абмяжавалася зьмяшчэньнем у паштовай скрынцы адказу, у якім прызнае пагрозу адміністрацыі нягрунтоўнай. Калі Бясьмертны піша аб недахопах бухгальтэрыі, дык рэдкалегія зьмяшчае, але лічыць неабходным даць ад сябе дабаўку аб тым, што ў бухгальтэрыі ўсё добра, між тым, як праз некаторы час паказаныя рабкораўскай заметкай факты выкрываюцца і справа перадаецца ў крымвышук.

Высьветлена, што на працягу цэлага году ня было ніводнага рабкораўскага сходу і рэдкалегія складалася з адказных працаўнікоў сувязі. Старшынёй рэдкалегіі зьяўляецца загадчык ашчадкасы тав. **Жукаў**, член рэдкалегіі т. **Гласно**, загадчык тэлеграфу, а астатнія члены рэдкалегіі—выключна з высока-кваліфікаваных працаўнікоў, радавых жа работнікаў у рэдкалегіі няма. Газэта знайшла неабходным даць месца на сваіх старонках лісту былога начальніка пошты Бурко—(140 радкоў), зьместам якога зьяўляюцца выключна агульныя разважаньні.

Трэба тэрмінова пераабраць склад рэдкалегіі, якая ня здольна з бальшавіцкай рашучасьцю разгарнуць крытыку і самакрытыку, не зважаючы на асобы. Парт'ячэйка канторы сувязі, разам з новым складам рэдкалегіі, павінна павесьці шырокую растлумачальную працу аб значэньні крытыкі і самакрытыкі, уцягваючы ў шэрагі рабкораў нізавых працаўнікоў сувязі і лепшых ударнікаў.

Лапціхоўскі, Жыцельзейф і **Папіш.**

Партыйнае кіраўніцтва недастатковае

Існуючая на шклозаводзе «Ноўка» насьценгазета не адпавядае свайму прызначэньню і не адбівае жыцьця заводу. Выходзіць яна нерэгулярна і на заметкі, зьмешчаныя ў ёй, як адміністрацыя, так і партыйны і камсамольскі калектывы не рэагуюць. Тлумачыцца гэта, у першую чаргу, тым, што зусім адсутнічае партыйнае кіраўніцтва газэтай.

У самай працы калектыву КП(б)Б заводу «Ноўка», таксама як і ў калектыве КСМ, маюцца яўныя праявы правай практыкі. Так, справа членаў партыі **Дзіка, Вальтэра і Сьпірыдонава** аб п'янстве была перададзена на разгляд бюро калектыву, але разгледжана ня была і нават бюро знайшла магчымасьць рэкамендаваць **Вальтэра** ў сэкратары ФЗК, які, да рэчы казаць, ужо раней меў вымову за п'янку і быў адазваны з курсаў.

Не вядзецца ніякай працы сярод жанчын і даклад аб гэтым на бюро калектыву ніколі не заслухоўваўся. Падрыхтоўкай да вясеньній сяўбы бюро калектыву таксама амаль зусім не займалася. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгорнута слаба.

Праца камсамольскага калектыву таксама кульгае. Езьдзіўшы на зьезд ЛКСМ сэкратар бюро калектыву **Крыжэвіч** не азнаёміў камсамольскую масу з рашэньнямі зьезду і дагэтуль маўчыць. У момант адсутнасьці **Крыжэвіча**, яго намесьнік склікаў бюро калектыву, на якім былі разгледжаны справы аб п'янках камсамолак **Суранавай, Сьпірыдонавай, Бікімавай і Калінаўскай** і вынесена пастанова зрабіць над імі палітсуд. Але прайшло каля двух месяцаў, а пастанова гэтая ў жыцьцё не праводзіцца, **Суранава** нават паслана на курсы рахункаводаў.

Праца з камсамольцамі не вядзецца. Агульныя сходы камсамольцаў, а таксама і паседжаньні бюро скліканюцца рэдка.

Трэба прыняць тэрміновыя меры да аздараўленьня партыйнага кіраўніцтва заводу.

Завадзкі.

Сарваўшых нараду—да адказнасьці

19 га сакавіка ГарКК—РСІ і рэдакцыя газэты „Віцебскі Пралетары" склікалі нараду старшынь рэдкалегій, шматтыражак і насьценгазэт гораду і старшынь расьсьледбюро рэдкалегій па пытаньні праверкі ходу шэфства прадпрыемстваў над установамі і ўзмацненьня работы расьсьледбюро. Пытаньне вельмі важнае, але-ж, ня гледзячы на тое, што ўсе рэдкалегіі і асабліва іх старшыні павінны былі прымаць актыўны ўдзел у гэтай нарадзе, бо і на сёньняшні дзень пытаньне шэфства прадпрыемстваў над установамі і тэрміновае рэагаваньне на заметкі не знайшлі свайго належнага праламленьня ў жыцьцё на мясцох,—старшыні рэдкалегій нават самых буйнейшых прадпрыемстваў („Прафінтэрн", «Чырвоны Мэталіст», «Лекерта», «Дзьвіна» і інш.) не зьявіліся і нарада была сарвана.

Зрыў нарады старшынь рэдкалегій яшчэ раз падкрэсьлівае тое, што некаторыя старшыні рэдкалегій ня шукаюць новых мэтадаў працы, працуюць па старынцы і наогул безадказна адносяцца да справы.

Зрыўшчыкі нарады павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Н. Дварсон.

Нарада старшынь рэдкалегій

Сёньня, 21 сакавіка, у памяшканьні ГарКК РСІ (Замкавая 26, пакой № 4) а 7-й гадзіне ўвечары, у другі раз склікаецца нарада старшынь рэдкалегій і бюро расьсьледваньня ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў гораду.

Яўка абавязкова. Незьявіўшыяся будуць прыцягнуты да партыйнай і камсамольскай адказнасьці.

Масавы сэктар ГарКК РСІ і Рэдакцыя «Віцебскі Пралетары»

Па ранейшаму працуюць самацёкам

Прамфінплян выканан на 58,2 проц.

Выкананьне праграмы за 1-ю дэкаду сакавіка на заводзе «Чырвоны Мэталіст» не дае яшчэ неабходных вынікаў, ня гледзячы на тое, што на гэтую дэкаду завод меў галоўны від сыравіны—чыгун,—**бесьперабойна.**

Прыбыўшыя на завод у канцы лютага швелеры № 16 далі магчымасьць пусьціць згатоўленыя і сабраныя дэталі па лябёдках і з намечаных на дэкаду 64—выпушчана 106. Такім чынам, лічыцца выкананьне па лябёдках 165,6 проц., а фактычна нічога, бо клёпка рам з швелераў—адна з найпрасьцейшых работ.

Па ранейшаму маецца адставаньне па галоўнаму віду асноўнай прадукцыі па плугох ДТРЛМ, **яніх з 664 выпушчана 397, а па акучніках замест 2336 выпушчана 1068, альбо 45,7 проц. заданьня.** Па баронах «Гонк-Мо» замест 336, **выпушчана 112**, па карнярэзках замест **168—16.** Такім чынам, калі ўлічыць зробленыя ў розны час і толькі «выпушчаныя» у гэтую дэкаду лябёдкі, дык у сярэднім прамфінплян **выканан на 58,2 проц.**

Вялікае адставаньне па сельгасмашынабудаўніцтву тлумачыцца адсутнасьцю жалеза 45-х 12 да плуга ДТРЛМ і аднаго гатунку жалеза да акучніка пры наяўнасьці астатніх відаў сыравіны ў дастатковай колькасьці.

Такое становішча тлумачыцца тым, што ня гледзячы на неаднаразовыя паказаньні, што неабходна хутчэй наладзіць вучот у цэхах, а таксама перавесьці цахі на гаспадарчы разрахунак, каб больш зацікавіць цэхавую адміністрацыю сваёй гаспадаркай,—да гэтага часу нічога ня зроблена і ўся праца разьлічана на самацёк, на тое, што нехта павінен клапаціцца аб забесьпячэньні, вучоту і г. д.

Папіш.

Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам кіруюць

На зьлёт ударнікаў Віцкамтрэсту з 500 рабочых і афармленых 150 чал. ударнікаў зьявілася толькі каля 75 чалавек. На зьлёце выявілася, што прарыў у выкананьні праграмных заданьняў ідзе на памяншэньне, замест 6—8 вагонаў на лініі ў сьнежні, у лютым ідзе 14 вагонаў. У выніку сыгналаў насьценгазэты маецца значны зрух у рабоце рамонтных брыгад.

Але на гэтых дасягненьнях нельга застанаўлівацца. Заданьне—19 вагонаў на лініі—павінна быць выканана. Гогалеўская лінія павінна быць поўнасьцю адкрыта. Ніводнага вагона не павінна зварочвацца ў дэпо на рамонт. Энтузіазм работнікаў камтрэсту не падхоплен трыкутнікам. Створаныя ўдарныя брыгады з-за адсутнасьці кіраўніцтва распаліся. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва існуе на паперы. Выкананьне саццагавораў нікім не правяралася. Лжэўдарнікі не выяўляліся. Чорная і чырвоная дошкі не скарыстоўваліся. Насьценная газэта не ўдзяліла належнай увагі асьвятленьню работы па сацспаборніцтву і ўдарніцтву. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі не павярнуліся тварам да вытворчасьці.

З-за няўважлівых адносін [illegible] работы прамфінплян па трав[illegible]ваю выканан з перавышэньне[illegible] выдаткаў энэргіі з-за няспраўнасьці паветранай сеткі. Маецц[illegible] вялікая ўцечка энэргіі, за вагонамі няма належнага нагляд[illegible] яны няправільна і несваечасо[illegible] змазваюцца, у выніку чаго—ч[illegible]стае гарэньне буксаў, хутка [illegible] знашваньне бандажэй і калода[illegible] паломка восей. Працоўная дысцыпліна значна пала. Нявых[illegible]ды і спазьненьні на работу зай[illegible]маюць вялікае месца ў ка[illegible] трэсьце.

У спрэчках таварышы адзна[illegible]чалі шэраг недахопаў у рабоце. Загадчык гаражу Махавіцкі н[illegible] выкананьне прамфінпляну і[illegible]кнуўся тлумачыць выключн[illegible] „аб'ектыўнымі" прычынамі. Н[illegible] зьлёце многа гаварылі аб тым, што міліцыя не ўдзеляе належнай увагі рэгуліроўцы вулічнага руху. Правілы вулічнага руху [illegible] карыстаньня трамваем ня ве[illegible]конваюцца, а міліцыя за гэты[illegible] не сачыць.

Зьлёт абраў штаб з 13 чал[illegible] век і вызначыў шэраг канкрэ[illegible]ных мерапрыемстваў па зьн[illegible]шчэньню ўсіх недахопаў, як [illegible] галіне выкананьня прамфінпл[illegible]ну, так і кіраўніцтва сацспабо[illegible]ніцтвам і ўдарніцтвам. **Дворк[illegible]**

Завод „Камінтэрн" няўважліва адносіцца да тэрміновых заказаў

Паводле загаду ВСНГБ, завод «Камінтэрн» павінен абслугоўваць фанэрны завод ліцьцём.

10-га лістапада паравая машына на фанэрным заводзе папсавалася і завод скараціў сваю выпрацоўку на 40—50 проц. Для таго, каб папраўвіць машыну, быў дан заказ заводу «Камінтэрн» на часткі, але яны да гэтага часу ня зроблены. Акрамя таго, былі заказаны дзьве балваны для прэса, рамкі для баўмэгі, пошань для прэса, якія «Камінтэрн» пасьля многіх тыдняў цеганіны з сім адмовіўся рабіць.

Адносіны завода «Камінтэрн» [illegible] тэрміновых работ фанэрнага завода дрэнныя і патрабуюць умяшацельства адпаведных органаў.

Р. В.

Безгаспадарчасьць зрывае працу

12 сакавіка, на другой зьмене ў закройным цэху **фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі»** папсаваліся тры закройныя машыны. Патрэбен быў невялікі рамонт, але гаек у запасе не аказалася. Мэханічная майстэрня адмовілася іх тэрмінова зрабіць, тлумачачы адсутнасьцю інструмэнтаў. З за гэтага на двух зьменах не работалі каля 10 рабочых і плян цэху быў сарваны.

Такія моманты на фабрыцы невыпадковы. Рабочыя сваечасова сьлізавалі аб гэтым, але гаспадарчы цэху і фабрыкі нічога не рабілі. Гэта безгаспадарчасьць каштуе надчайна дорага і зрывае выкананьне прамфінпляну закройнага цэху, а тым самым і усёй фабрыкі.

Неабходна вінаватых у разгільдзяйстве і безгаспадарчасьці прыцягнуць да адказнасьці.

Цыр[illegible]
Крыва[illegible]

БЛІЖЭЙ ПРЫЦЯГНУЦЬ РАБОЧЫХ

да непасрэднай кіруючай працы ў савецкім апараце

ДЭПУТАТЫ ГАРСАВЕТУ—УДАРНІКІ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ ПАВІННЫ СТАЦЬ УДАРНІКАМІ Ў ПРАЦЫ ГАРСАВЕТУ

Аб становішчы арганізацыі старастатаў і аб сацыялістычным сумяшчэньні

(Пастанова прэзыдыуму віцебскага гарадзкога савету ад 18-га сакавіка 1931 года)

Заслухаўшы інфармацыю аб рабоце старастатаў і задачах сацыялістычнага сумяшчэньня, прэзыдыум гарсавету **пастанаўляе**:

1. Масаваму аддзелу гарсавету зараз-жа разгарнуць працу створаных на некаторых буйных прадпрыемствах дэпутацкіх груп—старастатаў і пашырыць арганізацыю іх на астатніх прадпрыемствах.

2. Пераглядзець склад бюро дэпутацкай групы на панчошнай ф-цы ў бок стварэньня яго з асоб, якія па ўмовах сваёй працы будуць мець магчымасьць удзяліць яго працы максымум увагі.

3. Адзначаючы надзвычайную маруднасьць у стварэньні дэпутацкіх груп на чыгуначным вузьле і вялась ць працы ў гэтым напрамку з боку мясцовых арганізацый,—прасіць гарком КП(б)Б і прафсавет узьдзейнічаць на парткалектыў і УЧК аб аказаньні ўсямернай дапамогі па стварэньню старастатаў на чыгунцы.

4. Распачаць у канцы сакавіка прыёмныя дні членаў прэзыдыуму гарсавету на прадпрыемствах, з папярэднім шырокім растлумачэньнем значэньня прыёмных дзён сярод рабочых мас і належнай арганізацыйнай і тэхнічнай падрыхтоўкай гэтых дзён. Распачаць прыём перш на ф-цы імя Лекерта, якая выдзяляецца з шэрагу іншых, лепшай да гэтай справы падрыхтоўкай.

5. З прычыны адсутнічаньня вопыту працы старастатаў і пазаштатных інструктараў, запытаць па гэтаму пытаньню Моссавет, Харкаўскі і Саратаўскі гарсаветы, дзе гэтае ўжо ўведзена і дзе ўжо маецца належны вопыт у гэтай працы. Для асабовага азнаямленьня і вывучэньня на месцы пастаноўкі працы дэпутацкіх груп, вылучыць брыгаду з дэпутатаў гарсавету—ударнікаў для паездкі і азнаямленьня з пастаноўкай гэтай працы ў Харкаве.

6. Прымаючы пад увагу тое вялізарнае значэньне, якое павінна адыграць сацыялістычнае сумяшчэньне—уцягненьне рабочых з вытворчасьці ў работу непасрэдна ва ўстановах, не адрываючы іх ад сталай працы на вытворчасьці—лічыць неабходным ужыць у рабоце гарсавету сацыялістычнае сумяшчэньне.

Даручыць т.т. Пракопенка, Азарэнкавай, Сьвярдлову, Рубіну і Левіну ў 2 тыднёвы тэрмін падрыхтаваць праэкт арганізацыі інстытуту пазаштатных інструктараў і камесьнікаў інспэктараў і загадчыкаў пасобнымі аддзеламі гарсавету (нарасьвета, праца, сацзабясьпечаньне, камунаддзел і інш.).

7. Выклікаць Менскі гарсавет на сацспаборніцтва па арганізацыі і разгортваньню працы дэпутацкіх груп і правядзеньні сацыялістычнага сумяшчэньня.

8. Масаваму аддзелу, праз сэкцыі і рэдакцыі «Віцебскі Пралетары» на старонках газэты разгарнуць растлумачальную працу сярод рабочых мас вакол паказаных вышэй задач масавай работы гарадзкога савету.

Важнае мерапрыемства

Сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) падкрэсьліў «...неабходнасьць рашучай і хутчэйшай перабудовы саветаў у адпаведнасьці з каранным задачамі сучаснага пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва".

Вялізарныя задачы, якія мы ставім сабе ў трэцьцім рашаючым годзе пяцігодкі, патрабуюць рашучага павароту гарсавету тварам да вытворчасьці, тварам да прамфінпляну, патрабуюць шырокага ўцягненьня працоўных мас у кіруючую працу савецкага апарату.

Друкуемая сёньня пастанова прэзыдыуму гарсавету аб разгортваньні працы дэпутацкіх груп старастатаў і стварэньні іх на ўсіх прадпрыемствах, а таксама аб увядзеньні сацыялістычнага сумяшчэньня, мае вялізарнае значэньне.

Гэтае мерапрыемства зьяўляецца адной з форм ажыцьцяўленьня пастаноў XVI зьезду УсеКП(б), якіх пастанавіў: «...уважліва вывучаць і пашыраць маючыйся вопыт прыцягненьня да кіраўніцтва дзяржавай рабочых мас, што застаюцца на вытворчасьці, вопыт перадачы рабочым выкананьня пасобных функцый дзяржапарату».

Намечаны гарсаветам вопыт сацыялістычнага сумяшчэньня—уцягненьня рабочых з вытворчасьці ў працу ў апараце гарсавету ў якасьці намесьнікаў загадчыкаў пасобнымі аддзеламі і інспэктарыятамі апошняга, не пакідаючы непасрэднай сваёй працы на вытворчасьці,—трэба ажыцьцявіць і шырока папулярызаваць як новую ў нашых умовах каштоўную форму прыцягненьня да непасрэднага кіраўніцтва дзяржавай рабочых мас, што застаюцца на вытворчасьці, з тым, каб форму гэтую пашырыць потым і на працу іншых устаноў і прадпрыемстваў.

П. Пракопенка.

Прыняць меры да бязьдзейных

Сэкцыя працы і забясьпекі шмат увагі ўдзяляе пытаньню падрыхтоўкі кадраў і забясьпечваньня прадпрыемстваў гораду рабсілай. Гэта пытаньне было абгаворана на бюро і пленуме сэкцыі і на чарговым паседжаньні пленуму сэкцыі. Зноў ставіцца даклад сэктара кадраў аб ходзе ўкамплектаваньня школ ФЗВ, курсаў, ЦІТ'у і курсаў пры прадпрыемствах, для чаго бюро сэкцыі даручыла камісіі кадраў пры сэкцыі абсьледваць гэта пытаньне і на пленуме будзе заслухан садаклад брыгады. Зразумела, што гэта ёсьць адзін з баявых вучасткаў працы ў рабоце сэкцыі і ўся ўвага сэкцыі павінна быць накіравана на гэту галіну працы.

Побач з гэтым неабходна адзначыць, што некаторыя дэпутаты гарсавету сэкцыі працы і забясьпекі ня прымаюць актаўны ўдзел у яе працы і некаторыя з іх ужо атрымалі вымовы ад мандатнай камісіі за ненаведваньне пленумаў сэкцыі. Яшчэ горш абстаіць справа з прымацаванымі, дзе з 40 чал. толькі 8 прымаюць удзел у рабоце сэкцыі. Гэта пытаньне таксама завастралася на пленуме сэкцыі і ўсім членам, кандыдатам сэкцыі і прымацаваным катэгарычна прапанавана наведваць пленумы сэкцыі і прыняць актыўны ўдзел у працы гарадзкога савету і сэкцыі. У адносінах да бязьдзейных павінна быць пастаўлена пытаньне аб іх вывадзе з складу гарсавету.

Кожны член, кандыдат гарсавету павінен актыўна ўдзельнічаць у рабоце гарсавету і па ўдарнаму выконваць тыя задачы, якія перад ім пастаўлены.

Наўмені.

Ёсьць зрух

Каапэрацыйная сэкцыя актыўна ўзялася за работу. Яўка членаў і кандыдатаў сэкцыі на пленум—85—90 проц. Яўка прымацаваных—50—60 проц.

Пленумы сэкцый праходзяць вельмі актыўна, шмат таварышоў выступаюць у спрэчках, даючы канкрэтныя прапановы. Уся сэкцыя разьбіта на брыгады, якія ўжо прыступілі да абсьледваньня шэрагу прадпрыемстваў. Зараз ідзе абсьледваньне закрытых разьмеркавальняў на МББ чыгунцы, акулярнай фабрыцы, панчошнай і інш. Нядаўна на пленуме сэкцыі быў заслуханы даклад прадстаўніка ЦРК т. Гутмана аб грамадзкім харчаваньні. Выступаўшыя таварышы казалі аб неабходнасьці зьнижэньня цаны на абеды і паляпшэньня іх якасьці.

Сэкцыя па дакладу т. Гутмана вынесла шэраг каштоўных прапаноў па палепшаньні грамадзкага харчаваньня гораду.

Адным з недахопаў у рабоце сэкцыі трэба лічыць тое, што газэта «Савецкая Беларусь» сярод членаў, кандыдатаў сэкцыі і прымацаваных не распаўсюджваецца і гэта пытаньне на пленуме не завастралася.

Н.

Прымаем выклік менскага гарсавету

Амаль усе дэпутаты уноў абранага Віцебскага гарсавету зьяўляюцца ўдарнікамі з вытворчасьці.

Адсюль вывад—дэпутаты гарсавету—ударнікі на вытворчасьці—павінны пасьлядоўна зьяўляцца ўдарнікамі ў працы гарсавету. Увесь гарсавет, ня толькі па складу, але галоўнае — па зьместу і тэмпах сваёй працы павінен зьяўляцца ўдарным. Пасобныя сэкцыі гарсавету павінны абвясьціць сябе ўдарнымі і заключыць паміж сабою сацумову за лепшае правядзеньне ўскладаемых на кожную з іх задач.

Трэба цьвёрда ведаць, што выкананьне тых вялізарнейшых задач, якія стаяць перад гарсаветам—органам дыктатуры пралетарыяту ў справе сацыялістычнага будаўніцтва ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі,—патрабуюць рашучай перабудовы ўсяе нашае працы, патрабуюць надзвычайнай сур'ёзнасьці ў працы і сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў, якія-б забясьпечвалі пасьпяховае выкананьне стаячых перад намі задач. Гэткія тэмпы павінны зьяўляцца законам, неад'емлемай умовай на ўсіх вучастках нашай працы.

К прадстаячаму пленуму гарсавету (к канцу сакавіка), як у апараце гарсавету, так і па сэкцыях мы павінны падлічыць праробленае за гэты кароткі час пасьля перавыбараў, выкрыць ўсе самыя дробязныя недахопы і рашуча пераключыцца на ўдарныя, сапраўдна бальшавіцкія тэмпы работы.

На гэтым пленуме мы будзем заключаць сацумову з Менскім гарсаветам, які абвясьціў сабе ўдарным і выклікаў на сацспаборніцтва Віцебскі гарсавет. Падрыхтавацца да гэтага мы павінны са ўсёй сур'ёзнасьцю.

П. П.

Спаборніцтва на выпіску газэт ня выконваецца

Вайсковая сэкцыя Віцебскага гарсавету на першым сваім арганізацыйным паседжаньні пастанавіла—ўсім членам сэкцыі падпісацца на газэты: «Савецкая Беларусь» і чырвонаармейскую «Чырвоная Зьвязда» і выклікала на сацспаборніцтва іншыя сэкцыі гарсавету.

Водгуку на гэты заклік няма. Стала быць, сацспаборніцтва не ажыцьцяўлена і калі якой сэкцыяй і прынята, дык не праводзіцца ў жыцьцё і апашляецца.

«Савецкая Беларусь» зьмяшчае на сваіх старонках усе распараджэньні ўраду, зьмяшчае амаль штодзённа кіруючы матарыял па савецкаму будаўніцтву і зьяўляецца неад'емлемай патрэбай кожнага дэпутата гарсавету.

Пытаньне жыцьця і працы Чырвонай арміі, пазнаньне ваеннай тэхнікі і наогул ваенізацыі насельніцтва маюць адбітак у чырвонаармейскай газэце. Мы, не стаячыя у радох Чырвонай арміі, павінны чытаць гэтую газэту. Гэтае асабліва датычыцца вайсковай сэкцыі наогул і ў прыватнасьці былых чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў, якія цалком прымацаваны да гэтай сэкцыі. Нажаль, пакуль-што ня ўсе члены сэкцыі выпісваюць гэтую газэту і сваю пастанову аб падпісцы на газэту яны яшчэ ня выканалі. Трэба выправіць гэты недахоп.

Маецца пастанова прэзыдыуму гарсавету аб прыёме выкліку Менскага гарсавету на сацспаборніцтва па шырокаму распаўсюджваньню «Савецкай Беларусі» і «Известий». Трэба адзначыць, што гэтая пастанова пакуль што не знайшла водгуку сярод усяе масы членаў гарсавету. Большая частка іх ня выпісваюць гэтай газэты. Сацспаборніцтва мы ня выканалі і відаць застаемся ў хвасьце.

Трэба членам і кандыдатам гарсавету, а таксама прымацаванаму да сэкцый актыву выйсьці ў сацспаборніцтве па выпісцы газэт першымі (праз тыдзень, прыблізна, будзе зроблена праверка вынікаў сацспаборніцтва).

Барацьбу за якасьць прадукцыі паставіць у цэнтры увагі адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу

Больш адказнасьці

Якасьць вырабу заводу „Камінтэрн" адыгрывае вялікую ролю ў якасьці вырабу іншых фабрык і заводаў. Чым вышэй якасьць выпускаемых заводам вырабаў, тым вышэй якасьць прадукцыі, выпускаемай кожнай дэтальлю. Але, ня гледзячы на гэтае, якасьць прадукцыі на заводзе ў сучасны момант значна культае, асобныя рабочыя дрэнна адносяцца да палепшаньня якасьці. Маецца нават сярод некаторых рабочых, адказных за якасьць, імкненьне спасылацца выключна на «аб'ектыўныя» прычыны, спэкулюючы на недахопе чыгуна і іншых матарыялаў.

Праглядаючы акты аб браку, можна ўпэўніцца, што большы процант дрэннай якасьці нельга прыкрыць аб'ектыўнымі прычынамі, а брак залежыць ад саміх рабочых. У рабоце заводу павінна быць уведзена сыстэма адказнасьці за вырабляемую прадукцыю. Кожны павінен адказваць ня толькі за сваю дэталь, але і за апэрацыю.

Інструктары і загадчыкі цэхамі павінны сачыць за тым, каб бракаваныя дэталі не адпраўляліся на склад. Уводзімая зараз новая сыстэма па кантролю за якасьцю і па чоткасьці разьмежаваньня функцый кожнага адказнага за яе, павінна быць шырока растлумачана сярод усіх рабочых, як на агульных сходах, так і праз насьценную газэту. Неабходна ўвесьці ў сыстэму прэміраваньне за прапановы па палепшаньні якасьці прадукцыі і кантроль над якасьцю.

Аса.

Па віне цэхавай адміністрацыі ня выконваюцца якасныя паказальніні

У вінтавым цаху фабрыкі Лекерта неаднаразова склікаліся сходы і нарады па пытаньнях палепшаньня якасьці прадукцыі. На адным з апошніх сходаў была вынесена пастанова каб праца першых праэсаў была ўзмацнёна і пушчаны канвэер, бо ў працяўным выпадку ў цьвікавых машын бывае затрымка, работа перакідваецца з месца на месца, атрымоўваюцца розныя парапіны і іншы брак.

Калі з 27 лютага цэх перайшоў на работу па канвэеру, дык гэта з першых жа дзён дала выкананьне прамфінпляну як колькасна, так і якасна. Але гэта зусім ня цікавіць загадчыка цэхам т. Хацянава, аб якім неадразова пісалі, і які ня лічыцца ні з якімі пастановамі. У выніку няўважлівых адносін Хацянава, у цэху зноў затрымкі і наплыў нядабраякаснай прадукцыі.

Гэтыя моманты няўважлівых адносін да якасьці прадукцыі павінны зараз-жа быць ацэнены па заслугах арганізацыямі фабрыкі.

Рэканд.

Тав. Швілпа адмаўляецца змагацца з бракам

Многа гаварылі і пісалі аб тым, што на заводзе **„Чырвоны мэталісты"** вялікі процант браку. Палепшаньня няма. Выпадкі браку маюцца як па віне рабочых, так і адміністрацыі.

Зусім ганебным зьяўляецца той факт, што рабочы гісельнага цэху з 42 станін для точак зрабіў 17 бракаваных, тлумачачы гэта тым, што яму малая плата.

Кантрольны апарат, майстры, прыёмшчыкі не ўявілі сабе неабходнасьці барацьбы за якасьць і часам сачаць толькі за колькасьцю, а бракаваны палуфабрыкат разгульвае па ўсіх цэхах, што адбіваецца на інтэнсіўнасьці працы рабочых і на выкананьні праграмы.

Загадчык загатоўчага цэху т. **Швілпа** не ўдзяляе ўвагі зьнішчэньню браку ў палуфабрыкаце, што выклікае прастоі і г. д. Самае горшае гэта тое, што т. Швілпа ня хоча прызнаваць сваіх памылак у гэтым напрамку, а наадварот заяўляе, што брак быў і будзе. Неабходна рашуча ўдарыць па ліквідатарскіх настроях на заводзе. **Збоеў.**

Ажыцьцявіць пастановы УсеЦСПС і ВСФК аб працы фізкультурных арганізацый

Кожны фізкультурнік—ударнік

Фізкультурная арганізацыя Віцебску на падставе пастановы 1-й усесаюзнай фізкультурнай канфэрэнцыі і УсеЦСПС аб перабудове фізкультурнай працы па вытворчаму прынцыпу, пачала ў некаторых гурткох наладжваньне палітычна-масавай працы. Пакуль узяліся за справу гурткі краўцоў, мэталістых, МББ чыг. і скурнікі. Вакол пытаньня перабудовы фізкультурнай арганізацыі тварам да прамфінпляну і калгасаў, тварам да палітычна-гаспадарчых задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, яшчэ ня ўзьнята думка ўсіх камсамольскіх ячэек і фізкультурных арганізацый.

Неабходна па ўдарнаму завяршыць паварот фізкультурнай арганізацыі тварам да вытворчасьці. Адначасова ня трэба забываць, што ўцягваньне рабочых і працоўнай моладзі ў шэрагі фізкультурнікаў—першачарговая задача.

У бліжэйшы тэрмін усе гурткі фізкультуры павінны намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні пастаноў УсеЦСПС і фізкультурнай канфэрэнцыі.

Касы.

Прымеце выклік

11 сакавіка ў клюбе саюзу саматужнікаў адбыўся сход камсамольцаў, разам з фізкультурнікамі—авіахэмаўцамі, які заслухаў даклад аб задачах фізкультуры і авіахэмаўскай арганізацыі.

Сход абгаварыў пытаньне аб задачах камсамолу, працоўнай моладзі ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і абвясьціў сябе мабілізаваным на лепшае правядзеньне вайсковa-фізычнай падрыхтоўкі.

Аднагалосна рашано арганізаваць вайсковую роту і прасіць гарсавет ТДА-авіахэму прызначыць камандзіра для кіраўніцтва заняткамі. Сход таксама абвясьціў сябе ўдарным па правядзеньні ваенных заняткаў і выклікаў на сацспаборніцтва скурзавод і фабрыку імя Лекерта.

Дзьмітроў.

НА ПАПОЎСКА-КУЛАЦКІ ВЯЛІКДЗЕНЬ

ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ АДКАЖУЦЬ УЗМАЦНЁНАЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ, СТВАРЭНЬНЕМ НОВЫХ КАЛГАСАЎ, ВЫКАНАНЬНЕМ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕМ ПРАМФІНПЛЯНАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ

БЯЗБОЖНІКІ, АКТЫВІЗУЙЦЕ СВАЮ ПРАЦУ!

Тысяча дзевяцьсот трыццаць першы раз

Вялікдзень—галоўнае хрысьціянскае сьвята. У адзнаку ад іншых рэлігійных сьвят, яно зьвязана з доўгім пэрыядам узмацнёнай папоўскай агітацыі. Легенда аб Хрысьце штогод на працягу 19 з лішнім стагодзьдзяў знаходзіла найбольш яркі свой выраз менавіта ў вялікодныя дні. Апранутая ў пышныя эвангельскія фразы, яна зноў і зноў напамінала працоўным масам аб неабходнасьці «цярпеньня і малітвы», «аб непраціўленьні злу», і г. д. Вялікодны пэрыяд, пагэтаму, заўсёды быў пэрыядам асабліва ўпартай пропаведзі хрысьціянскага вучэньня.

Але, працоўныя масы сталі іншымі, чым у мрачную эпоху крыжа і бізуна. Фразы „аб любві к бліжнему" зараз зьяўляюцца проста сьмешнымі, а казаньне аб непраціўленьні—контррэвалюцыйным.

Пропаведзь „міра і любві" у вуснах хрысьціянскай царквы заўсёды была маскіроўкай братаўбійственых войн у інтарэсах пануючых клясаў. Вялікодныя казаньні аб „любві к бліжнему" гаварыліся нават тады, калі сотні тысяч і мільёны прававерных хрысьціян уцягваліся папамі і капіталістымі ў самыя крывавыя пабоішчы.

Пропаведзь „міра і любві" таксама не адпавядае гістарычнай сапраўднасьці, як і легенда аб хрысьце. Першае даказана крывавым зьместам усёй хрысьціянскай гісторыі, а другое—навукай. І сапраўды, хіба не хрысьціянскія кулямёты расстрэльвалі дзесяткі тысяч рабочых і сялян савецкай краіны ў годы грамадзянскай вайны? Хіба бяз удзелу хрысьціянскіх місій войскі ангельскіх і францускіх імпэрыялістых грамяць бязбройныя паселішчы кітайскіх сялян, падняўшыхся на барацьбу супроць сваіх прыгнетацеляй? Хіба, урэшце, нядаўні паход папы рымскага супроць СССР адказвае пропаведзі «усечалавечаскай любві» і хіба ліхаманкавая падрыхтоўка інтэрвэнцыі ня пахне крывёю дзясяткаў мільёнаў людзей?

Менавіта гэта зьяўляецца асноўным і галоўным, што дапамагло і дапамагае працоўным масам пазбавіцца ад рэлігійнага дурману. Але папы перабудоўваюць сваю прапаганду, поруч з кулаком і шкоднікам, штодзень вядуць сваю падрыўную работу супроць разгорнутага сацыялістычнага наступу.

«Друг друга абымем, рцэм браціе»—пяюць папы ў вялікдзень.

А Маркс вучыў, што гісторыя чалавецтва ёсьць гісторыя клясавай барацьбы. У гэтай барацьбе хрысьціянская царква заўсёды была на старане пануючых клясаў. Крыж і эвангельле заўсёды служылі і служаць падлегласьці мільёнаў рабочых і сялян рабаўладзельчаскаму рэжыму абшарнікаў і капіталістых.

Царкоўныя арганізацыі былі і застаюцца яркімі выразьнікамі капіталістычнага рабства, лютымі супраціўнікамі сацыялізму, дапаможнікамі кулацтва і контррэвалюцыі.

Вялікдзень—«сьвята сьвят» у хрысьціянскай царкве і менавіта таму яно выкарыстоўваецца духавенствам для зрыву сацыялістычнай пяцігодкі. Працоўныя масы СССР не дадуць сябе ашукаць. Яны адкажуць на папоўска-кулацкі вялікдзень узмацнёнай падрыхтоўкай да другой бальшавіцкай вясны, стварэньнем соцен і тысяч новых калгасаў, выкананьнем і перавыкананьнем прамфінплянаў сацыялістычных фабрык і заводаў.

І. Б.

Антырэлігійную працу зрабіць штодзённай

У Віцебску амаль што на ўсіх прадпрыемствах зусім не праводзіцца аніякай антырэлігійнай працы. Гарадзкі савет ваяўнічых бязбожнікаў сьпіць моцным сном і актыў яго, за выключэньнем 4—5 чалавек, распаўся. Такое становішча выкарыстоўваюць нашы клясавыя ворагі і мы бачым за апошні час шмат выпадкаў адкрытага выступленьня розных царкоўнікаў на прадпрыемствах, якія праводзяць сваю шкодную працу (дзякан **Мамайкін**, эвангелісты **Сямькоў** — завод «Чырвоны Мэталіст»). Цікава, што калі ў Віцебск прыехаў інструктар саюзу ваяўнічых бязбожнікаў з Масквы, дык віцебскі гарсавет бязбожнікаў ня ведаў як і з якога боку распачаць працу.

З вялікімі цяжкасьцямі было скалочана некалькі брыгад, якія заняліся аглядам становішча працы бязбожнікаў на прадпрыемствах. Брыгады высьветлілі шмат брыдкіх фактаў. Так, высьветлена, што на скурзаводзе на чале ячэйкі саюзу ваяўнічых бязбожнікаў стаіць былы поп **Асноўскі**, які ня толькі не растлумачваў шкоду рэлігіі, але нават тармазіў гэтую працу.

Гарадзкі савет ваяўнічых бязбожнікаў павінен прачнуцца і шырока разгарнуць антырэлігійную працу, зрабіўшы яе штодзённай на кожным прадпрыемстве і ўстанове.

Н. Галубцоў.

Зусім не працуюць

Янавіцкая ячэйка ваяўнічых бязбожнікаў не працуе. Старшыня ячэйкі **Каваленка** яшчэ ніводнага разу ня склікаў сход і не правёў ніводнай кампаніі. Бязбожная і антырэлігійная літаратура выпісваецца ў малай колькасьці, а антырэлігійная газэта ня выпісваецца зусім.

Трэба, каму сьлед зацікавіцца гэтай ячэйкай і ажывіць яе працу.

Голва.

Клюб „Прафінтэрн" пачаў падрыхтоўку

Клюб «Прафінтэрн» пачаў падрыхтоўку да антывялікоднай кампаніі. Значная частка гэтай працы падае на чытальню і бібліятэку гэтага клюбу.

Зараз у чытальні наладжан куток бязбожніка і арганізавана выстаўка кніг аб паходжаньні багоў, вялікадня і г. д. Для лепшага распаўсюджваньня антырэлігійных кніг сярод рабочых на прадпрыемствах арганізаваны спэцыяльныя кніга-перасоўкі. Апрача гэтага наладжана электрычная антырэлігійная бібліятэка.

З 1134 кніг, знаходзячыхся ў бібліятэцы, маецца каля 500 антырэлігійных. На гэтых днях наладжваецца спэцыяльная антырэлігійная выстаўка сярод працоўных і чытачоў.

Побач з дасяненьнямі маюцца і адмоўныя бакі ў працы. Так, напрыклад, гурток ваяўнічых бязбожнікаў яшчэ даволі ня рыхтуецца да сустрэчы вялікадня.

І. Эйдлін.

Поп прабраўся ў ячэйку бязбожнікаў

Пры аглядзе ячэйкі **СВБ скурзавода** высьветлілася, што сэкратаром у ячэйцы працуе **поп Асноўскі** (адначасова ён зьяўляецца рахункаводам завода), які разваліў працу. Трэба тэрмінова ўбраць чужака Асноўскага з ячэйкі бязбожнікаў, а таксама зьняць яго з пасады рахункавода.

Партыйнай і камсамольскай арганізацыям і заўкому тоэба пераабраць бюро ячэйкі СВБ і наладзіць яе працу, адначасова пачаць растлумачальную антырэлігійную работу на заводзе.

Ю—ц.

Сэктанцкі дабродзей у „рабочай" блюзе

У пачынаючай майстэрні пры шчаўкінай фабрыцы працуе клясавы вораг—актыўны-сэктант-эвангеліст Суравенка. Зараз яго вылучылі ў інструктары майстэрні. Прыкрываючыся рабочай блюзай, ён мае яшчэ большую магчымасьць праводзіць сэктанцкую антысавецкую агітацыю.

Сэктанцкага прапаведніка Суравенка трэба тэрмінова зьняць з працы, а разам з гэтым і ўзьняць антырэлігійную і інтэрнацыянальную працу ў майстэрні.

Г—ў.

Шырэй прасунуць вайсковыя веды у масы

Ажывіць працу ТДА-авіахэмаўскіх ячэек

Ячэйка ТДА-авіахэму сьпіць

Прайшло шмат часу, як у віцебскай канторы сувязі адбыліся перавыбары ячэйкі ТДА авіахэму. Бяручы прыклад з ячэйкі Мопр і Культмычкі, заснула і ячэйка ТДА-авіахэму. Тры тыдні, як пераабралі бюро, але да гэтага часу яшчэ не разьмеркавалі паміж сабою абавязкі.

У канторы сувязі працуе 280 асоб, з якіх авіахэмам ахоплена толькі 100. Маецца вялікая запазычанасьць членскіх узносаў. 180 чал. ня ўцягнуты ў ячэйку.

Вайсковага гуртка няма. Калісьці ён быў, але зараз распаўся. Калі на рабчкоме паставілі пытаньне аб адчыненьні вайскова-фізкультурнага гуртку, дык старшыня культмасавага сэктару т. **Сьмірнова** сказала: «у нас няма сродкаў. Нам трэба ў першую чаргу купіць у клюб гадзіньнікі, а не адкрываць гурток».

Працаўнікі сувязі плятуцца ў хвасьце ў сэнсе вайсковай падрыхтоўкі. Характэрны прыклад. **Камсамолец Пазьняк уцягнуў у ячэйку 15 асоб.** Гэтую справу ў такім-жа напрамку ён хацеў праводзіць далей, але бюро ячэйкі ТДА-авіахэму не дапамагло яму праводзіць гэтую працу. Калі трэба было падпісаць членскія кніжкі, дык т. **Градмёў** адказаў: «у нас пакуль невядома хто будзе сакратаром, а я ня маю права падпісваць».

Неабходна безадкладна разбудзіць бюро ад доўгага сна. Трэба тэрмінова наладзіць працу ячэйкі ТДА авіахэму.

Ю.

Ваенізацыя не ў пашане

Вайсковая праца ў **ФЗВ краўцоў**, дзе навучаецца звыш 300 чалавек, адсутнічае. Сувязі з падшэфнай часткай Чырвонай арміі няма. Гурток ваенізацыі, у якім раней было 100—150 чалавек, зараз распаўся.

Праца ячэйкі ТДА авіахэму зусім не адчуваецца. Да 13 й гадавіны Чырвонай арміі ніякай растлумачальнай працы сярод вучняў ня было праведзена.

Трэба ажывіць вайсковую працу.

Ляк.

Чарговы выпуск санітараў-інструктараў

Пры віцебскім вайсковым гошпіталі нядаўна адбыўся пяты выпуск 33-х санітарных інструктараў-уневайскавікоў. Курсанты на працягу 3-х месяцаў ударнымі тэмпамі скончылі сваю праграму. Большасьць курсантаў—рабочыя, сяляне беднякі і калгасьнікі.

Пасьля ўрачыстага вечару курсанты абвясьцілі сябе ўдарнікамі—варашылаўцамі. **Трое курсантаў абяцалі арганізаваць новыя калгасы, шырока разгарнуць працу па ваенізацыі рабочай і калгаснай моладзі, арганізаваць ячэйкі «Чырвонага крыжу».**

Ударнікі заключылі сацыялістычны дагавор. Апошні час праверкі выкананьня аб'ектаў сацдагавора вызначан 1-е мая. 7 ударнікаў паехалі ў калгасы.

Ударнікі вынесьлі за добрыя адносіны да працы таварыскую падзяку **тт. Бархатаву, Казлоўцаву, Падгорнаму і інш.**

Віт. Сьвірыдаў.

Рабочых ад варштату — на пэдфак

Пытаньне аб падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў у сучасны пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы набывае актуальнейшае значэньне. Найбольш востра стаіць пытаньне зараз з падрыхтоўкай пэдкадраў з рабочага асяродьдзя. Цяпер адбываецца вясновы прыём на пэдфак Беларускага Дзяржаўнага унівэрсытэту і з 226 пададзеных заяў маецца з боку рабочых і іх дзяцей і батракоў толькі 50.

Яшчэ нядаўна беларускія нацыянал-дэмакраты, контррэвалюцыянэры мелі сваіх ідэалёгаў Лёсіка, Смоліча, Некрашэвіча і іншых, як на пэдфаку, так і ў Беларускай Акадэміі навук, і рыхтавалі кадры для зьвяржэньня дыктатуры пралетарыяту, для падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць Савецкага саюзу. Зараз правядзена значная праца ў галіне барацьбы з ідэалёгічна варожымі навуковымі працаўнікамі і студэнтамі, але неабходна з непаслабнай упартасьцю і надалей праводзіць гэтую барацьбу і замяняць варожых нам працаўнікоў і студэнтаў пасылкай на вучобу рабочых ад варштату і вылучэньнем іх на навуковую працу.

Віцебск, як буйны прамысловы горад Беларусі, павінен зараз-жа вылучыць найлепш падрыхтаваных рабочых, каб як мага хутчэй ліквідаваць прарывы на фронце ідэалёгічнай барацьбы. Прыём праводзіцца на такія аддзяленьні: прыродазнаўчае, літаратурнае, ідэалёга-пэдагагічнае і палітасьветнае. У гэтым годзе пры літаратурным аддзяленьні адчынена творчая сэкцыя, якая рыхтуе кадры для беларускай пралетарскай літаратуры, крытыкаў і газэтных працаўнікоў. Кожнае аддзяленьне мае сэкцыі: беларускую, яўрэйскую і польскую.

Толькі пры самай актыўнай дапамозе з боку партыйных, прафсаюзных і іншых арганізацый задача падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў на ідэалёгічным фронце будзе выканана.

Брыгадзіры: **Х. Сіманенка, М. Брукаш.**

Прыём заяў на пэдфак БДУ

Пэдагагічны факультэт Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту абвяшчае веснавы прыём студэнтаў на наступныя аддзяленьні: 1) прыродазнаўчае, 2) літаратурна-лінгвістычнае, 3) палітасьветнае і 4) пэдалёга-пэдагагічнае. Пры кожным аддзяленьні маюцца сэкцыі: беларуская, яўрэйская і польская. Заявы з дакумантамі можна падаваць не пазьней 23-га сакавіка культпрапрацаўнікам сваіх фабзаўкомаў, альбо кіраўніку спраў гарпрафсавету т. Гутэрман (Палац працы, пакой № 21).

Усе заявы будуць забраны брыгадзірамі па вярбоўцы рабочых, праз некалькі дзён разгледжаны прыймовай камісіяй пэдфаку і аб выніках і пачатку заняткаў будзе паведамлёна кожнаму паасобку.

Брыгада.

Недахопы у рабоце пошты ня выпраўлены

Адміністрацыя і рабачком ня цікавяцца

У газэтнай экспэдыцыі канторы сувязі няма ніякага парадку. Працаўнікі экспэдыцыі адносяцца да працы дрэнна. Інструктар **Гофман** ня інструктуе экспэдытараў і лістаносцаў. Шмат лістаносцаў па сваіх вучастках ня выбралі пераходзячых картак на газэты і часопісы, ня гледзячы на тое, што сярод іх былі гадавыя, якія патрэбна было выбраць з 1-га сакавіка і па сёньняшні дзень. З-за гэтага падпісчыкі не атрымліваюць сваечасова газэты. Грамадзкай думкі вакол дрэнна працуючых не складаецца. Загадчык канторы сувязі **Жабінскі** і старшыня рабачкому **Шышкін** у газбюро зусім не заглядваюць і не зварочваюць увагу на тых, хто парушае працдысцыпліну.

Пара адміністрацыі і рабачкому дабіцца лепшых узораў у працы газбюро. **Рыгорка.**

Наладзіць сваечасовую дастаўку

Газбюро ўстанавіла календарны плян для здачы падпіскі на часопісы і газэты. Але падпісчыкі усё-ж газэт і часопісаў сваечасова не атрымоўваюць, а нават ёсьць выпадкі, калі атрымоўваюць са спазьненьнем на тыдзень і больш. Такое становішча у значнай меры адбіваецца на распаўсюджваньні газэт і часопісаў і маюцца выпадкі, калі рабочыя адмаўляюцца выпісваць газэты толькі з-за неакуратнасьці іх дастаўкі.

Газбюро, як відаць, гэтым пытаньнем ня цікавіцца і разумее, што толькі сваечасовая здача сьпіскаў падпісчыкаў дае станоўчыя вынікі ў распаўсюджваньні. Трэба ў хуткім часе наладзіць сваечасовую дастаўку.

Г. Вараб'ёў.

Чаму не дасылаюцца кнігі?

У мінулым навучальным годзе студэнты 1-га курсу Белпэдтэхнікуму выпісалі сабе дванаццацітомнікі збору твораў Леніна. Усе ўнесьлі па 1 р. задатку. Да сёньняшняга дня ніхто ніводнага тому не атрымаў.

Хто ў гэтым вінаваты?

Студэнт 2-га курсу ВБПТ **Гарбачоў М. А.**

Ці ёсьць адводы?

Ячэйкамі КП(б)Б прыняны ў кандыдаты партыі наступныя тав.:

Марозаў А. Д. (даўжанская яч.), Брайнін Якаў Хаімавіч (сампрамсаюз), Казлова В. С, Забароўская Н. Б, Каган Р. А., Рубіна Ю. Р., Алесіна С І., Крыцкая К А., Вайнштэйн Х. Б., Ландсман Н. Н., Канькоў С. В., Вэпражыцкі В. В., Ліверц Х. Б., Мэрсон Г. С., Саламон Л. Н., Плавінская А. С. (панчошная ф.), Цыфнос, Сокалава, Рынкоў (ф. «Сьцяг Індустрыялізацыі), Рухман (3-я ф. «Прафінтэрн»). Зарагацкая (скурзавод), Соеў П., Харытонаў А., Казіміраў Я («Чырвоны мэталіст»), Міхееў М. Я. (вэтінстытут), Каган І. (мэтпром 1), Герасімовіч П. П. (вэтінстытут), Лявонаў У. І. (каапэрацыйны т-м), Равіцкі Л. А. (яч. ФЗУ абутнікаў), Макарава Е. А. (пачэльны з-д будаб'яднаньня), Эгліт К. А. (хлебапякарня ЦРК), Пальцова М. А. («Прафінтэрн» № 3), Грачухін Р. П. (Н. дыв. ДПУ), Данец С. (Н. дыв. ДПУ), Нагібін А. (Н. дыв. ДПУ), Барадулін А. М. (войлачная ф.), Хітрак З. Н. (шчотачная ф.), Сьнегірава А. Р. (ваенны шпіталь), Аўчынікава Б. Е., Адзенцова Г. Я. (ваенны шпіталь), Гельман М. З. (электратэхнічны рабфак), Цыперсон Я. Д. (Белуціль), Кардашэўскі (камтрэст), Якушонак Л. Г. (інструмэнтальная ф.), Карасік М. А. (швэйн. ф. ім. Дзяржынскага), Давідан А. Г. («Прафінтэрн» 3.), Шпілеў (даўжанская яч.), Косаў Ф. К. (даўжанская яч.), Палякоў П. Д. (даўжанская яч.), Сьлесберг Ш. А. (пабудова панчошн. ф.), Марчанка П. М (МББ чыг).

Пераведзёны з кандыдатаў у сапраўдныя члены партыі наступныя т. т. Тоншаў П. С., Карэлін Д. К., Кручкоў М. П., Ярцесьеў Я. Я., Отсон Ф. Ц., Башкатаў У. Д. (МББ чыг.), Несьцяровіч (вэтінстытут), Васільеў А. З. (бабінцкая яч.), Авілін Я., Пячкуроў С. (даўжанская яч.), Маскелёў У. Я. (гарсавет), Гушчына (2-я шк. швэйнікаў), Передьштэйн Ю. (цагельны завод Белдзяржбуд.), Гельфанд А. (бабруйскі завод), Онбрэйт (шчацінная фабрыка), Бягуноў (алейны завод), Запалаў (ДПУ), Аглушэвіч (ЦРК), Гарадкоў Г. І. (воднікі), Цэйтліна М. В. (акулярная ф-ка), Чарняк С. Ш. (белуціль), Джу-Ю-Чан (цюцюнавая фабрыка), Глінская, Рабінкоў, Шмоткіна (ЦРК), Балюкевіч (інструмэнтальная ф-ка), Белавін (акулярная ф-ка), Філіпоўскі Н., Бульня Б., Кірук А., Гарчакоў П, Васілеўскі З. («Чырвоны мэталіст») Шафранскі, Зэйф, Берліна, Брук («Сьцяг індустрыялізацыі»), Кашнікава Н. Н., Касьцяноўская В. А., Гольдзіна Д., Куніна Г. Г., Сарокін У., Траян (панчошная фабрыка).

Просьба да ўсіх працоўных, маючых матывіраваныя адводы да паступленьня ў партыю і пераводу з кандыдатаў у сапраўдныя члены партыі вышэйпералічаных т. т., падаць аб гэтым у 3-дзённы тэрмін у пісьмовай форме ў Гарком КП(б)Б (Замкавая, 26).

Хроніка ЦРК

Для палепшаньня абслугоўваньня пайнікаў грамадзкім харчаваньнем, праўленьнем ЦРК вытвараецца пераабсталяваньне агульнадаступных сталовых і прымацаваньне да сталовых №№ 2, 7, 5, 17.

Усе арганізацыі, якія жадаюць атрымаць дакуманты для прымацаваньня да сталовых, павінны падаць запатрабаваньні ў аддзел грамадзкага харчаваньня да 22-га сакавіка для прымацаваньня да сталовай № 2 (Замкавая).

Адносна прымацаваньня да іншых сталовых будзе абвешчана асобна.

—о—

Прыём у маладзёжны тэатр

Адкрыт прыём у маладзёжны тэатр, які знаходзіцца пад ведамам Белдзяржтэатра. Прымаецца моладзь да 23 год.

Усе камсамольскія ячэйкі павінны вылучыць лепшых таварышоў для працы ў тэатры. За ўсякімі даведкамі зварочвацца ў пакой маладзёжнага тэатру, штодзённа з 5 да 7 гадзін увечары. Заявы прыймаюцца да 1-га красавіка.

—o—

Пачатак вясны

Сёньня, 21-га сакавіка,—дзень вясеньняга роўнадзеньня, г. зн. дзень і ноч роўны паміж сабой. Сёньня сонца ўсходзіць роўна а 6 гадзін раніцы, а заходзіць а 6 гадз. увечары.

Сёньняшні дзень для ўсёй паўночнай паўкулі лічыцца пачаткам вясны.

Безадкладна зрабіць агляд месц, якім можа пагражаць затапленьне

Загад па гораду Віцебску, ад 19 сакавіка 1931 года

На падставе пастановы Гарсавету ад 15-га сакавіка г. г. камісія па барацьбе з паводкам загадвае ўсім установам і прадпрыемствам, пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў устаноў, вылучыць адказную асобу па арганізацыі мерапрыемстваў па барацьбе з паводкамі, якой даручыць безадкладна зрабіць агляд месц, якім можа пагражаць затапленьне, а таксама высьветліць колькасьць маючыхся там матар'ялаў і прадуктаў, куды іх магчыма зьмясьціць і 22 га сакавіка, а 10-й гадзіне раніцы, зьявіцца ў камісію—Гарсавет, пакой № 13 для прадстаўленьня апошняй усяго матар'ялу і паказаньня, якія меры прымаюцца для папярэджаньня страт, а таксама для атрыманьня інструкцый.

Штаб па барацьбе з паводкамі зьмяшчаецца з 9 да 4-х гадзін дню ў Гарсавеце, пакой № 13—тэл. 1—83. Выклікаць т. Крывога, альбо Красноўскага, а з 4-х гадзін дню да 9 гадзін раніцы—у Замкавай пажарнай часьці—тэл. 1—19 Выклікаць т. Баршая.

Рэалізаваць азетлётарэю

Віцебскае гарупраўленьне АЗЕТ прыступіла да распаўсюджваньня білетаў 3-й Усесаюзнай азетлётарэі ў колькасьці 60.000 шт. білетаў. Распаўсюджваньне білетаў азэтлётарэі павінна праводзіцца як шырокая масавая кампанія, у якую павінны быць уцягнуты ўсе грамадзкія арганізацыі. К непасрэднаму ўдзелу ў правядзеньні азетлётарэі павінны быць прыцягнуты ўсе прафсаюзныя арганізацыі—фабзаўкомы, мясцкомы, каапэрацыя, навучальныя ўстановы, сампрамарцелі і жакты. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на распаўсюджваньне білетаў у Чырвонай арміі і на чыгунцы, бо ў мінулым годзе на гэтых вучастках ня было праведзена ўдавальняючай працы па распаўсюджваньню 2-ой Усесаюзнай лётарэі. Неабходна, каб гарком КП(б)Б, КСМ, гарпрафсавет забясьпечылі б і дапамаглі-б у правядзеньні даннай кампаніі належнымі дырэктывамі, лістамі, выступленьнямі.

Настаўніцтва павінна папулярызаваць азэтлётарэю сярод вучняў і іх бацькоў і прыцягнуць школы да непасрэднага распаўсюджваньня білетаў.

Кантрольныя лічбы, якія намецілі лётарэйная камісія, павінны ня толькі быць выкананы, але і перавыкананы і толькі тады будзе забясьпечана пасьпяховае правядзеньне даннай кампаніі.

Сацспаборніцтва павінна быць адным з галоўных мэтадаў па распаўсюджваньню лётарэі.

Неабходна шырока скарыстаць усе віды сацспаборніцтва паміж арганізацыямі, фабрыкамі, заводамі і ячэйкамі АЗЕТ.

Неабходна выстаўляць сустрэчны плян кантрольным лічбам і браць на буксір тых, якія адстаюць у гэтым напрамку.

Трэба практыкаваць індывідуальныя выклікі. Увесь ход правядзеньня лётарэйнай кампаніі трэба асьвятляць на старонках насьценгазэт фабрычна завадзкіх газэт і газэты «Віцебскі Пралетары».

Рэйдкоры павінны ў гэтым напрамку адыграць асаблівую ролю. Трэба штодзённа праводзіць адзнакі па распаўсюджваньню і ходу азетлётарэі на спэцыяльных дошках, асабліва важна дабіцца, каб на білеты азетлётарэі падпісваліся-б калектыўна цэлы цэх, установа ці завод.

Каб дабіцца посьпеху ў лётарэйнай працы, трэба разгарнуць шырока прапагандысцкую працу, якая б папулярызавала азетлётарэю, таму што правядзеньне лётарэйнай кампаніі ні ў якім разе не павінна быць адарвана ад галоўнай мэты віцебскай азетарганізацыі—арганізацыйна замацаваць і ажывіць працу. Пагэтаму лётарэйная кампанія павінна прайсьці пад лёзунгам «уцягненьне ў т-ва АЗЕТ шырокіх колаў працоўных».

Я. Рывінзон.

Выклікаем

Я, член праўленьня саюзу працасьветы, бяру 10 білетаў АЗЕТ лётарэі і выклікаю пасьледваць майму прыкладу наступных таварышоў: Шыёнка, Галамбек, Залівака, Гімельшайна, Міхайлоўскую, Лайко, Шчуцкага, Клімянкова, Гарадзенчыка, Паль, Руткоўскага і Сінявока.

Д. Верамава.

Адклікаючыся на выклік Дваргона, набываю 10 білетаў лётарэі АЗЕТ і выклікаю пасьледваць майму прыкладу: Ланціхоўскага, Ходырава (лесзавод № 13) і Баганава (Мэтпром № 3).

Г. Кагаи.

Я, супрацоўнік газэты «Віцебскі Пралетары» **Н. Дваршон** набыў 10 білетаў 3-й Усесаюзнай лётарэі АЗЕТ і выклікаю пасьледваць майму прыкладу тт.: Гонікмана, Кліонскага, Рубінштэйна, Праковенка, Каменштэйна, Кабішчара, Кагана Г., Левіну, Цукермана, Якаўлева (рабфак), Южыка, Канапаціна і Начынскага.

Нарад у ФЗВ чыгуначнікаў г. Краснадару

Гараддзяленьне АЗЕТ атрымала нарад для яўрэйскай працоўнай моладзі ў ФЗВ чыгуначнікаў, у г. Краснадар на 10 асоб, узрост ад 16—17 год. Адукацыя ня ніжэй 4 гадкі. Прыбыцьцё на месца 1-га красавіка 1931 году. Заявы трэба падаваць тэрмінова, у гараддзяленьне АЗЕТ, у памяшканьне гарсавету пакой № 30, з 9 да 12 гадзін.

Дзяк Мамайкін—вор і афэрыст

Паводзіны былога „рабочага" Мамайкіна на заводзе «Чырвоны Мэталіст» добра ўсім вядомы. Мамайкін значны час займаўся на дзяканскіх курсах, за што быў выключаны з саюзу і зволены з работы. Мамайкін з групай вароў-афэрыстаў, пад відам вадасьвецкіх кантралёраў, хадзіў па дамох, нібы з мэтай праверкі, выкручваў электрычныя лямпачкі і потым іх прадаваў.

Зараз нас паведамілі, што Мамайкін абраны... намесьнікам старшыні крамкамісіі куста № 28.

Трэба гнаць клясавага ворага з ЦРК, гэтай справай павінен зацікавіцца пракурор.

С. і М. Г.

У карысьць Мопр'а

У дзень 8-га сакавіка, у м. Лёзна сярод работніц, служачых і жонак рабочых сабрана ў карысьць Мопр'у 56 р. 55 к.

З арэны цырку

Першае месца ва ўноў адноўленай праграме цырка займаюць маладыя талёнавітыя сатырыкі **Роб і Гуд.** Віцебск ведае гэтых сатырыкаў па іх ранейшых выступленьнях. Ня цяжка ўбачыць, як далёка ўперад пайшлі Роб і Гуд за апошнія два гады. Гісторыя аб «мосьціку, хвосьціку, Іван Іваньчы з 20 парамі штаноў» адышла. Яе замяніла палітычна зусім прыемлемая вострая сатыра. Роб і Гуд каштоўны тым, што яны ня будуюць свой матар'ял на палітычнай трасакатні і пошлай гіранізацыі нашых цяжкасьцяў, а яны нясуць сваю сатыру на канкрэтных даволі цікавых фактах цяперашніх дзён будаўніцтва. Іх сатыра даходзіць да гледача.

Прапілегласьцю ім зьяўляецца выступленьне клёўнаў-буфонаў, адначасова і сатырыкаў **Макса і Аляксандра.** Толькі нядаўна цырк вызваліўся ад халтурышчыкаў-буфонаў Ларэнца, а зараз іх зьмянілі Макс і Аляксандр. Розьніца паміж Ларэнца і гэтымі клёўнамі тая, што першыя падносілі халтуру проста, без асаблівай афарбоўкі, а гэтыя ўпрыгожваюць яе ўрэ-ра грэвалюцыйнай фразай.

Строева Кашырская добрая выканаўца рэвалюцыйных і народных сьпеваў. Заслугоўвае ўвагі песьня «Турксіб», дзе Кашырская удаецца ў мастацкіх вобразах, з асаблівым пачуцьцём перадаць будаўніцтва Турксіба. З бадзёрасьцю выконвае яна песьню, прысьвечаную Дальня Усходняй Чырвонай арміі «Нас пабіць хацелі». Побач з гэтым, не пашкодзіла б Кашырскай жартлівую, больш правільней кажучы вульгарную песеньку «кузьнечыкі» зьмяніць на больш падыходзячы рэпэртуар.

З нумараў чыста-цыркавога жанру першае месца займае **Кошкіна** (штэйн трапэ). Кошкіна, як нельга лепш паказвае добрую трэніроўку і ўпартую працу над тым, каб зрабіць свой нумар чыста.

Не дасягаюць чыстаты выкананьня гімнасты **Сьцюард.** Тое самае можна сказаць і аб рамцы **Вейланд.** Нумары па свайму жанру для нашага гледача далёка ня новыя, а выкананьне куды слабейшае за былышых раней артыстых гэтага жанру.

Бэм і Джэры ня дрэнныя эксцэнтрыкі. З лёгкасьцю і хуткасьцю ім удаецца прарабіць самыя замыславатыя трукі.

Адзін час цырк апанавалі скачучыя лёрды. Артыстыя ў цыліндрах «вычачотвалі» хто як мог і што мог. Зараз гэтыя лёрды вызвалілі цырк. Замест іх прыехалі ня меншыя халтуршчыкі танцоры **Додэ і Новэр.** Што з сябе ўяўляе гэтая пара, даволі цяжка казаць. Адно можна зразумець, што на цыркавой арэне ім ня месца.

У канфэрансье дзядзі Вані рэклама для артыста ня дрэнна выходзіць, але часта яна не адпавядае рэчаіснасьці. Атрымоўваецца разрыў паміж сапраўдным выкананьнем і «гарачай» рэклямай. **О. Шульман.**

Агульна-гарадзкая канфэрэнцыя фабзавучаў і прафшкол,

якая склікаецца гарсаветам і гарпрафсавета **па пытаньнях становішча гэтых школ у горадзе і іх далейшых задачах** **адчыняецца** 22 га сакавіка, а 7 й гадз. увечары, у клюбе мэталістых.

Яўка абраных дэлегатаў, загадчыкаў, выкладчыкаў і інструктараў ФЗВ, дырэктараў, старшынь фабзаўмясцкомаў і сэкратароў калектываў камсамолу: МББ чыгункі, «Чырвоны Мэталіст», «Дзьвіна», ф-кі імя Кл. Цэткін, Тэкстыльаб'яднаньня, ф-кі «Сьцяг індустрыялізацыі», ф-кі імя Лекерта, Белдзяржкіно, Белдзяржбуд, дараддзелу, праўленьня ЦРК—абавязкова.

Нарада сэкратароў ячэек ЛКСМБ

22-га сакавіка, а 6 й гадз. увечары, у памяшканьні гаркому ЛКСМБ адбудзецца нарада сэкратароў наступных камсамольскіх ячэек па пытаньні выхаду ў вёску: «Чырвоны Мэталіст», «Камінтэрн», акулярная, голкавая, будаўнікоў, каапэрацыйны т-м, камтрэст, вэтінстытуту, кіноустаноў, «Сьцяг Індустрыялізацыі», «Прафінтэрн» № 1, «Лекерта» і ЦРК.

— 23-га сакавіка, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні гаркому КСМ склікаецца **нарада знакомасавых сэкратароў ячэек КСМ** па пытаньні: аб перабудове працы прафсаюзаў і ўдзел КСМ.

— 23-га сакавіка, а 6-й гадзіне ўвечары, у Доме асьветы адбудзецца сход загадчыкаў гарадзкіх школ. На абвестцы дню важныя пытаньні. Яўка ўсіх загадчыкаў гаршкол абавязкова.

— 22 га сакавіка, а 6-й гадзіне ўвечары, адбудзецца паседжаньне канфліктнай камісіі пры гаркоме камсамолу. На паседжаньне выклікаюцца наступныя т.т.: Зьскіна (скурзавод), Шэксьцер, Жыроўская (белпэдкурсы), Тэйс, Барабас (палітэхнікум), Квактун (яч. будаўнікоў), Лібэрман (панчошная), Вальштэйн (рабфак), Гінабург, Нікіціна, Лейзін (абутковая) і ўсе сэкратары ячэек.

Нарада актыву бязбожнікаў

Сёньня, а 6 г., у памяшканьні Палацы працы, пак. № 25, склікаецца інструкцыйная нарада бязбожнага актыву па пытаньню падрыхтоўкі да антывялікоднай кампаніі. На нараду павінны зьявіцца: члены і кандыдаты бюро ячэек СВБ і рэвізійных камісій, прадстаўнікі вайсковых частак, а таксама выдзеленыя па прадпрыемствах і ўстановах тт. па правядзеньню антывялікоднай кампаніі.

— Маюцца вакантныя месцы ў Факультэт савецкага будаўніцтва і права БДУ, умовы прыёма надрукаваны у газ «Зьвязда» ад 14-га сакавіка 31 г. Жадаючыя паеінчы падаваць заявы у культпроп гаркому КП(б)Б.

Нарада агітпропаў ячэек ЛКСМБ

У нядзелю, 22 га сакавіка, а 6-й гадз. увечары, у памяшканьні Гаркому ЛКСМБ адбудзецца нарада агітпропаў калектываў і ячэек КСМ.

Парадак дню:

1. Аб паходзе за рэвалюцыйную тэорыю.
2. Аб інтэрнацыянальнай эстафеце.

— Культпроп Гаркому КПБ склікае нараду партыйцаў і камсамольцаў палякаў, якая адбудзецца 24-га сакавіка, а 6 гадз. увеч., у памяшканьні польклюбу (Вагзальная 39). Яўка памянёных т. т. абавязкова ў парадку парт. і камсам дысцыпліны.

— 22 сакавіка, у 3 гадзіны дню, у памяшканьні гарсавету, пакой 33, склікаецца нарада загадчыкаў бібліятэк, на якую запрашаюцца старшыня бібліатэчнага аб'яднаньня.

— Сёньня, 21 сакавіка, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні гарсавету, (другі паверх пакой 33) склікаецца нарада загадчыкаў вячэрніх рабочых школ.

Абвестка дню: інфармацыя з месц аб становішчы школ, маючы пры сабе матар'ял з лічбамі і фактамі, вынікі абсьледваньня вячэрніх школ інспэктарам НКА.

— Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні гаркому (пакой № 6), склікаецца нарада жансэктару, на якую неабходна зьявіцца: тт. Левінай, Пескінай, Карэ, Новікавай, Паль, Фрэнкель, Ванідоўскай, Шнэйдэрман, Кабішчар і жансэктарам усіх ячэек.

Сакратарам ячэек забясьпечыць яўку ўсіх пералічаных таварышоў.

Нам. рэдактара **Н. І. Баруноў.**

ЦЫРК АНОНС! НА-ДНЯХ АННА ПЯТРОУНА РАСКАЗАВА. ВЯЛІКІ КОННЫ ЦЫРК ПАД КІРАЎНІЦТВАМ А. П. ШУМІЛАВА. Коні, аслы, каровы, буйвалы, вярблюды, алені, сабакі, мядзьведзі.

ГАРТЭАТР Сяэстаніі дзяржаўнага тэатру музкамэдыі і памопэры. Сёньня, у суботу, 21-га сакавіка, БАГДАДЗКІ ЗЛОДЗЕЙ музкамэдыя ў 3-х дзеях, пастаноўка Леаніда Новікава. Пач. а 8 гадз. увеч. Білеты—у касе тэатру.

БЕЛДЗЯРЖКІНО 2 кампадзіцыя, 16-га сакавіка
СПАРТАК Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Толькі 2 дні: 21 і 22 сакавіка, 2 фільмы ў адзін сэанс: 1) ЗА ЯГО ПРЫГОЖЫЯ ВОЧЫ, камэдыя. 2) ЛЕДАВЫ ЛЁС драма.
МАСТАЦКІ Пач. 1-га сэан. а 6 гадз. увеч. Новы амэрыканскі прыключэнчаскі фільм ПА СЬЛЕДУ. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно № 4 за 1931 г.
ПРАЛЕТКІНО Пач. 1-га сэансу роўна а 5½ гадз. увеч. ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ. Вядомы фільм ОВОД
У ПРАЛЕТКІНО штодзённа ідзе ДЗЁННЫ КІНО-СЭАНС для рабочых вячэрніх зьмен. Вядомы фільм ОВОД. Толькі 1 сэанс. Пачатак а 12 гадз. дню. Кошт білетаў 30 кап. і 25 кап.
ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР імя Макса Гельца у памяшканьні ПРАЛЕТКІНО. Шакалы равата. Толькі 1 сэанс. Пач. а 4 гадз. дню.

Згодна пастановы трэсту «Ільноканаплявадбуд», у Віцебску адкрыта і існуе 62-я група „Ільноканаплявадбуду" па Канатнай вул., № 12. Тэхнічны аб'яднаньне. 235 3 3

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Рабочы драматычны тэатр. Сёньня, у суботу, 21-га сакавіка, для саюзу будаўнікоў ЛЁДАЛОМ у 14 малюнках. Застаўшыяся білеты прад. у касе тэатра. У панядзелак, 23 га сакавіка, 1-ы спэк. для член прафсаюзаў ЛЁДАЛОМ. Білеты прадаюцца ў Палацы працы (кніжны кіоск з 9 г. раніцы да 4 г. дню. Цана месцам зьмяншона. Пачатак а 8 гадзін увечары. Па калектыўных заяўках скідка 35%.

ЦЫРК (т-ва «Прыхільнікі дзяцей») Сёньня, у суботу, 21-га сакавіка, НОВАЯ ГРАНДЫЁЗНАЯ ПРАГРАМА: 4 ЭМВАЛЬС, ІН ЦЭ, 3 ГЭКТАР, ГОТАМА, Н. Д СТРОЕВА-КАШЫРСКАЯ, РОБ і ГУД, МАКС і АЛЕКСАНДР, ДОДЭ і НОВЭР, ЛІДЗІЯ КОШКІНА, а таксама ўся трупа. Пач. а 8½ гадзін увечары. Канфэрансье І. В. Лебедзеў (дзядзя Ваня).

ОТДЕЛЕНИЮ МЕХАНИЗАЦИИ ПРИ УПРАВЛЕНИИ НАРАБА 5 НУЖНЫ: техник или чертежник-конструктор, инструктор-монтер по паровым и моторным установкам, инженер или техник, знающий автотракторное дело. Оплата по соглашению. С предложениями обращаться: Канатная № 12. Нараб 5. 328 5 4

Раённы зьезд спажывецкай каапэрацыі для стварэньня прыгараднага саюзу спажывецкіх таварыстваў адбудзецца ў гор. Віцебску 25 га гэтага сакавіка, а 12 гадз. дню, з наступнай абвесткай дню: 1) Даклад аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б і ЦКК студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб становішчы і далейшых задачах спажыўкаапэрацыі. 2) Справаздачны даклад райСТ і рэўкамісіі. 3) Даклад райСТ аб удзеле ў падрыхтоўцы правядзеньні пасеўнай кампаніі і садзейнічаньні калектывізацыі сельскай гаспадаркі. 4) Выбары праўленьня і рэўкамісіі саюзу. 5) Рознае. Яўка дэлегатаў абавязкова і без спазьненьня. Папярэдня зьявіцца трэба ў канторы т-ва (Арлоўская, № 36). Праўленьне спажыўтаварыства. 350-3—1

КАНТОРА СУВЯЗІ ПАВЕДАМЛЯЕ ўсіх абанентаў радыёточак, што пры заяўцы аб няспраўнасьці радыёточкі, належыць абавязкова паказваць № абанента, без чаго спраўленьне радыёточкі вытвараецца ня будзе. За неўнясеньне абанентнай платы на працягу 2-х месяцаў, точка выключаецца, а праз 2 тыдні, пасьля выключэньня, точка зусім зьнімаецца. Заг. тэх. часьці Гарадкіў. 326—3—3

ПРАЎЛЕНЬНЕ закрытага рабочага каапэратыва ШВЭЙНІКАЎ ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ па Канатнай вул., № 27. Праўленьне ЗРК швэйнікаў. 349—2—1

Да ўвагі кіраўнікоў прадпрыемстваў і фабзаўмясцкомаў! Улічваючы, што абноўленая газэта „ТРУД" зьяўляецца баявым кіраўніком сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, ВСНГБ і ЦСПСБ прапануюць, у мэтах лепшага абмену вопытам сацспаборніцтва і ўдарніцтва на іншых прадпрыемствах, правесьці падпіску на газэту „Труд" для лепшых ударнікаў з фонду прэміраваньня. ПАДПІСКУ ЗДАВАЙЦЕ ПОШЦЕ! Старшыня ВСНГ БССР Грысевіч. Старшыня ЦСПСБ Рыжоў. 347—2—2

Члены общества взаимопомощи, желающие определить своих детей в фабзавучы, должны заявить об этом комитету взаимопомощи. Приниматься будут дети в возрасте от 16 до 20 лет с образованием не ниже 5 классов семилетки. Запись производится ежедневно с 9 час. утра до 12 час. дня. Комитет взаимопомощи. 348—2—2

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакумэнты, якія лічыць несапраўднымі

Па раёнах

Камс. білет за № 241200 С. А. Гарабурда 47
Студэнц. білет Віцеб. вячэрн. рабфаку С. О. Гарабурда 48
Вайсковы дакумант Г. Е. Сянькова 49
Пашпарт Г. Е. Сянькова 50
Асабовая картка П. Д. Савво 51
Мэтрычны выпіс М. А. Бараноўскай 52
Вайсковы білет, выд. Сіроцінскім РВК, К. М. Белаўсава 53
Кн. Бешанк. спаж. т-ва Г. Карпава 54
Службовая ўневайск. кніжка Т. Р. Аксёнава 55
Вайск. асабовая кн. Д. Окунева 56
Мэтрыч. пасьвед., выд. Віцебскім загсам, К. Когаль 57
Мэтрыка Калдуновай О. Ф. 58
Вайсковая кніжка У. Р. Аўчыньнікава 59
Член. кніжка Віцеб. спаж. т-ва Е. К. Бязручанкава 60
Паявая кніжка Беш. спаж. т-ва А. Д. Мясаедава 61
Чл. кніжка Межынскага спаж. т-ва № 1641 Ф. А. Марчанка 62
Вайсковая картка П. М. Галдыцкага 63
Вайсковая кн. П. Ф. Буткоўскага 64
Вайсковая вуч. кн. С. Т. Усава 65
Дзіцячая наборная кн ЦРК № 2950 А. Сарвачова 66
Асабовая кніжка Д. Крыско 67
Асабовая кніжка Ф. Галавешка 68
Асабовая кніжка В. Грыневіча 69
Ваайсковы дакумант Д. Ф. Галай 70
Вайсковая кніжка Г. Ф. Гайдука 71
Пашпарт выд. Руднянскім с.-с. Т. А. Самсонавай 72
Чл. каап. кн. І. А. Брашкіна 73
Чл. кн. саюзу тэксцільшчыкаў № 152027 П. С. Праворнай 74
Паявая кн. Бешанк. каап. «Селянін» М. М. Базылеўскай 75
Вайсковая кніжка В. Шамкова 76

Віцгарліт № 1. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 14. Тыраж 10.000